ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 85 (2251)
25 кастрычніка 1968 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЫХАВАННЕ МОЛАДЗІ І ЗАДАЧЫ ЛІТАРАТУРЫ

У аўторак, 22 кастрычніка, адбыўся адкрыты сход партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі. З дакладам «Пісьменнікі і задачы камуністычнага выхавання моладзі ў святле пастановы ЦК КПСС «Аб 50-годдзі ВЛКСМ і задачах камуністычнага выхавання моладзі» выступіў намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» Васіль Зуёнак. Аб важнай ролі літаратуры ў выхаванні падрастаючага пакалення, аб тым, чым канкрэтна могуць і павінны адказаць беларускія літаратары на заклік партыі ствараць новыя яркія мастацкія творы, якія ўсталёўвалі б у свядомасці моладзі непахісную веру ў ідэалы камунізма, адлюстроўвалі б лепшыя рысы савецкага чалавека, выхоўвалі нянавісць да класавых ворагаў, іх ідэалогіі і маралі, гаварылі на сходзе Алесь Пальчэўскі, Станіслаў Шушкевіч, сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі Арсень Ваніцкі, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Янка Брыль, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» Алесь Бажко.

Па абмеркаваным пытанні сход прыняў разгорнутую рэзалюцыю, у якой заклікаў пісьменнікаў актывізаваць свае творчыя сілы на стварэнне твораў і кніг, якія б дзейсна служылі справе ідэйнага, патрыятычнага, маральнага і эстэтычнага выхавання юнага пакалення.

Пры Доме мастацкай самадзейнасці Мінскага абласнога савета прафсаюзаў працуе студыя выяўленчага мастацтва, якой вось ужо трэці год кіруе мастак Анатоль Зайцаў. У студыі займаецца каля 40 рабочых, служачых, студэнтаў, інжынераў. Студыйцы часта выходзяць на натуру, і нічога, што стаіць пахмурнае кастрычніцкае надвор'е, імжыць дождж. Пейзажы роднага краю захапляюць іх у любы час.

На здымку вы бачыце інжынера-будаўніка Юрыя Берковіча і рабочага Леаніда Іванова ў ваколіцах Мінска.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Будні АРХІТЭКТАРАЎ

ГОСЦІ СТАЛІЦЫ

Вы, магчыма, бачылі іх на вуліцах. Сярод шматлікіх гасцей сталіцы яны вызначаюцца тым, што пастаянна нешта занатоўваюць, малююць, здымаюць. Гэта — архітэктары. Мінск прываблівае іх прасторнымі плошчамі і магістралямі, сваімі палацамі, зялёнай акрасай. З многіх гарадоў краіны едуць у беларускую сталіцу дойліды.

Толькі за апошні час гасцямі Саюза архітэктараў БССР былі прадстаўнікі творчых саюзаў Масквы, Ленінграда, Бранска.

Маскоўскія мастацтвазнаўцы А. Абрамаў і Т. Шчалканцава вывучаюць вопыт стварэння спартыўных будынкаў. У Мінску іх зацікавілі Палац спорту і закрытыя плавальны басейн.

Пяць дзён правялі ў беларускай сталіцы ленінградскія архітэктары Л. Якаўлева, А. Лаўроўская, М. Назар'ін, А. і А. Арашонкавы. Пасля знаёмства з горадам яны сустрэліся з намеснікам галоўнага архітэктара Мінска Я. Заслаўскім. Ён пазнаёміў гасцей з перспектывамі развіцця нашай сталіцы на бліжэйшыя дзесяць гадоў.

Бранскія архітэктары В. Сідараў і Ю. Тарабрын прыехалі ў Мінск, каб пазнаёміцца з вопытам афармлення грамадскіх інтэр'ераў і творамі манументальнага мастацтва. Яны пабывалі ў мінскіх палацах, кафэ, магазінах, наведалі майстэрню па праектаванні мемарыяльных збудаванняў інстытута «Мінскпраект». Намеснік начальніка Упраўлення па справах будаўніцтва і архітэктуры Мінгарвыканкома Ю. Градаў пазнаёміў бранцаў з праектам мемарыялу ў вёсцы Хатынь, які на конкурсе Чацвёртага Усесаюзнага злёту ўдзельнікаў паходу «Дарогай славы бацькоў» у Кіеве атрымаў першую прэмію.

ГОРАД СЁННЯ І ЗАЎТРА

Так ужо заведзена ў Саюзе архітэктараў: пасля вяртання з пленумаў, нарад, канферэнцый іх удзельнікі трымаюць справаздачу...

На гэты раз аб'ява абвясціла пра сустрэчу з удзельнікамі нарады па ландшафтнай архітэктуры ў Таліне. На вечар у Дом архітэктараў прыйшлі супрацоўнікі Дзяржбуда БССР, «Мінскпраекта», Трэста зялёнага будаўніцтва, Батанічнага саду, тэхналагічнага інстытута, дзе сёлета пачалі рыхтаваць інжынераў-азеляняльнікаў.

«Горад як асяроддзе працы і адпачынку» — пра гэту галоўную тэму дыскусіі ў Таліне гаварыла дацэнт кафедры архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута А. Сычова. Кіраўнік сектара ландшафтнай архітэктуры Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР І. Рудэнка спыніўся на нарматыўных пытаннях зялёнага будаўніцтва, архітэктар «Мінскпраекта» В. Шыльнікоўская — на надзённых праблемах фарміравання гарадскога ландшафту. Вялікую цікавасць на нарадзе ў Таліне выклікаў праект зоны адпачынку на Заслаўскім водасховішчы, якая з'явіцца працягам славутага «зялёнага дыяметра» Мінска. Адзін з аўтараў праекта Н. Трахтэнберг падзяліўся думкамі аб асаблівасцях «зялёнай забудовы» новых раёнаў. Удзельнікам вечара былі паказаны каляровыя дыяпазітывы аб вопыце прыбалтыйскіх сяброў.

У наступны тыдзень секцыя горадабудавання наладзіла ў Доме архітэктараў сустрэчу з удзельнікамі пленума праўлення Саюза архітэктараў СССР, прысвечанага забудове цэнтраў гарадоў. Намеснік галоўнага архітэктара Мінска Я. Заслаўскі і кіраўнік майстэрні «Мінскпраекта» М. Дзятлаў расказалі пра новыя тэндэнцыі ў горадабудаванні, пра аб'яўлены Дзяржбудам, Саюзам архітэктараў БССР і выканкомам Мінскага гарадскога Савета конкурс на распрацоўку эскізнага праекта планіроўкі і забудовы цэнтра Мінска.

СПРАЕКТАВАНА Ў БРЭСЦЕ

Брэсцкія кінатэатры патрабуюць рэканструкцыі. Яны даўно ўжо не адпавядаюць патрэбам горада, які пастаянна расце, штодня прымае сотні экскурсантаў. Першым у рыштаванні адзеўся кінатэатр «Беларусь». Праект яго рэканструкцыі распрацавалі галоўны архітэктар брэсцкіх майстэрняў «Белдзяржпраекта» Р. Шылай і група інжынераў пад кіраўніцтвам С. Мартынава і В. Самцова. У новым будынку «Беларусі» будуць дзве глядзельныя залы — на 1000 і 400 месц. Паветра ў залах будзе кондыцыяніраваным. Аўтары зусім адмовіліся ад выкарыстання гукапаглынальных матэрыялаў. Гук у залах будуць не гасіць, а факусіраваць. Такая сістэма акустыкі ў кінатэатрах рэспублікі яшчэ не ўжывалася.

Праект перабудовы «Беларусі» — не адзіны індывідуальны праект, распрацаваны сёлета абласнымі майстэрнямі «Белдзяржпраекта». З паметкай «1968» выдадзена рабочая дакументацыя на рэканструкцыю школы-дзесяцігодкі на вуліцы Маскоўскай (аўтары В. Бабашкін і А. Міхальчук). Па праекце Р. Шылая і інжынера Л. Лепяшкевіча пачнецца будаўніцтва 96-кватэрнага дзевяціпавярховага жылога дома на вуліцы Леніна.

ВЫСТАЎКА Ў АБЛАСНЫМ ЦЭНТРЫ

У Віцебску адкрылася архітэктурная выстаўка. Яна праводзіцца ў рамках рэспубліканскай справаздачы-агляду Саюза архітэктараў БССР і мае ў экспазіцыі работы майстроў, якія прымалі ўдзел у забудове абласнога цэнтра і буйнейшых раённых гарадоў. Асобныя стэнды расказваюць пра перспектывы будаўніцтва ў новых мікрараёнах, планіроўку сельскіх населеных пунктаў, рэканструкцыю старых плошчаў і магістраляў.

Выстаўка — перасоўная, пасля паказу ў Віцебску яе мяркуецца паказаць у Наваполацку, Оршы і іншых гарадах вобласці.

САПРАЎДЫ ПРАФЕСІЯНАЛ

«Хобі» бываюць розныя. Нярэдка яны звязаны з прафесіяй, «вынікаюць» з яе.

Анатоль Голад з дзяцінства маляваў. Захапленне паўплывала на выбар жыццёвага шляху — Анатоль стаў архітэктарам. А архітэктару, як кажуць, сам бог наказаў маляваць...

На «мастацкім» асабістым рахунку галоўнага архітэктара праектаў «Прамэнергапраекта» А. Голада — удзел у многіх мастацкіх выстаўках, самадзейных і прафесіянальных. А зараз Дом архітэктараў нададзіў яго персанальную выстаўку.

Акварэлі на выстаўцы — нібы справаздача аб шматлікіх паездках па краіне. Аб гэтым гавораць ужо самі назвы — «Талін», «Тэлавіў», «Судак», «Барысаглебск», «Калінінград», «Растоў».

— Я шмат гадоў ведаю Анатоля, — кажа кіраўнік студыі выяўленчага мастацтва Дома архітэктараў Іван Стасевіч, — і з задавальненнем адзначаю яго рост. Тры яго работы экспануюцца ў гэтыя дні на рэспубліканскай выстаўцы, прысвечанай пяцідзесяцігоддзю камсамола. Гэта вялікі гонар для аматара.

Неўзабаве ў Маскве адбудзецца Усесаюзны агляд творчасці маладых архітэктараў. На здымку нашага карэспандэнта А. Каляды вы бачыце ўдзельніцу пасяджэння праўлення Саюза архітэктараў БССР А. Лысенку, Ю. Грыгор'ева, С. Паўлава, С. Мусінсіага, якія абмяркоўваюць работы маладых гомельскіх архітэктараў.

ТУРЫСЦКІМІ СЦЯЖЫНКАМІ

Шмат гадоў у «Белдзяржпраекце» працуе секцыя турызму. Турысты — а іх у інстытуце каля сотні — пабывалі ўжо ў Сярэдняй Азіі, на Каўказе, у Карпатах. Нямала паходаў — летніх на шлюпках, зімовых на лыжах — было зроблена па роднай рэспубліцы. Не раз праекціроўшчыкі ўдзельнічалі ў спаборніцтвах турыстаў і займалі прызавыя месцы.

Летась беларускія архітэктары выязджалі на Памір, сёлета — у Прыэльбрусе. З сабой бралі кінакамеры, фотаапараты. Так з'явіліся аматарскія фільмы «Па Сярэдняй Азіі» і другі, які пакуль што не мае назвы. Ён расказвае пра сустрэчы і прыгоды ў гарах Каўказа. Экзотыцы далёкіх падарожжаў прысвечана фотавыстаўка «Мы гэта бачылі на свае вочы».

Днямі турысты «Белдзяржпраекта» запрасілі да сябе ў госці турыстаў «Мінскпраекта» і «Белгіпрагандлю». Удзельнікам летніх паходаў ветэраны секцыі — І. Блок, А. Лур'е, Э. Арцёмчык — уручылі пасведчанні і значкі.

Якім будзе чарговае падарожжа праекціроўшчыкаў?

— Канчатковы маршрут яшчэ не вызначаны, — гаворыць Ірына Блок, якая кіравала паходам на Каўказ, — але хутчэй за ўсё мы «пройдземся» па Горным Алтаі.

ГОМЕЛЬСКІЯ НАВАСЕЛЛІ

Вячаслаў ПЯТРОЎ

Сёння мы ўжо добра зразумелі, што выдаткі на мастацкае ўбранне грамадскіх памяшканняў досыць хутка акупляюцца. Цяпер нашы інтэр'еры перажываюць сапраўднае эстэтычнае абнаўленне.

Цяжка было ўявіць сабе, што можна зрабіць у памяшканні старога будынка Гомельскага краязнаўчага музея, якое амаль не рэканструявалася. Задача мастакоў ускладнялася тым, што само паняцце музея ў наш час змянілася. Нашы музеі абнаўляюць не толькі сваё аблічча, але і сваю сутнасць — спрабуюць адысці ад «музейнай цішыні», «камернасці», імкнуцца актыўна прапагандаваць матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці мінулага і сучаснасці. Маладыя мастакі Я. Пакаташкін, М. Навіцкі, Б. Кузьмічоў, якія займаліся абнаўленнем інтэр'ераў музея, перш за ўсё стараліся архітэктурна-мастацкімі прыёмамі змяніць унутранае аблічча музея, дабіцца, каб экспанаты загаварылі на поўны голас. Меркавалася, што абраныя імі прыёмы прасторава-пластычных і мастацкіх рашэнняў уступяць у разнастайныя актыўныя ўзаемаадносіны з экспанатамі. На жаль, мастакам не заўсёды ўдавалася здзейсніць свае імкненні — часта іх абмяжоўвалі цесныя памяшканні старога будынка.

Асаблівасці арганізацыі інтэр'ера, уласцівыя ўсім залам, — аддзелка сцен белымі драўнінна-стружачнымі плітамі, шкляныя вітрыны — лёгкія, без пераплётаў, інтэр'еры і кампаноўка экспанатаў падпарадкаваны дзвюм задачам — зацікавіць гледача і не даць яму стаміцца. Выразнасць экспанатаў падкрэсліваецца фонам. Так, напрыклад, у раздзеле гісторыі ўзнікнення першабытных паселаў на Гомельшчыне экспанаты ад узаемадзеяння з чорным або белым фонам то як бы выступаюць наперад, то адыходзяць на другі план. Сярод храматычнага ў цэлым асяроддзя гэтай залы маляўнічым акордам гучыць невялікая дыярама — стаянка старажытных людзей. Дыярама акаймавана выразнай чорнай паласой на фоне белага ўвагнутага экрана.

Ад залы да залы нарастае рытм агляду кампазіцый. Мастакі ўжываюць прыёмы інтэрпрэтацыі старадаўніх гравюр, уводзяць у экспазіцыю элементы моцна ўздзейнічаючага кантрасту. Вось у адной з залаў — пазалочаныя кандэлябры, ампірная мэбля, дарагія карціны, багатае адзенне (усё гэта на фоне імітаванага пакоя палаца), а ў другім куце гэтай жа залы — бедная сялянская хаціна, жабрацкі набытак, абраз, лапці...

Звязана з папярэднімі заламі прасторавымі, прапарцыянальнымі, каларыстычнымі суадносінамі і наступная зала, прысвечаная нарастанню рэвалюцыйнага ўздыму ў Беларусі перад Вялікім Кастрычнікам. Партрэты рэвалюцыянераў, лістоўкі, нелегальныя газеты, кайданы, данясенне царскіх сатрапаў пра рэвалюцыйны мясцовы гурток — вось, бадай, і ўсе экспанаты. Але дакументы пададзены так, што ні адзін не губляецца сярод астатніх. Дынамізм агляду гэтай залы паступова нарастае і завяршаецца манументальным пано «Далоў самаўладства!».

Нямала знаходак у мастакоў і пры складанні экспазіцый, прысвечанай прыродзе Гомельшчыны. Актыўна ўжываюцца буйнафарматныя фатаграфіі, дэкаратыўныя малюнкі, разнастайныя прыгожыя шрыфты. Прыгожа ўвагнутыя экраны над вітрынамі хаваюць архітэктурныя хібы памяшкання. На гэтых экранах добра кампануюцца фатаграфіі і надпісы. Эмацыянальнай насычанасці атмасферы экспазіцыі нямала спрыяюць дэкаратыўныя вітражы ў аконных праёмах, якія літаральна праменяцца ад сонечнага святла.

Работа мастакоў у цесным кантакце з навуковымі супрацоўнікамі музея прынесла свой плён — музей ажыў, пазбавіўся «музейнай пішыні».

Адзін з лепшых у горадзе — будынак нядаўна адкрытага рэстарана «Беларусь» (архітэктар Л. Тамкоў, інжынер С. Гінзберг). Лаканічна і выразна вырашаны яго экстэр'ер. Ясныя прапорцыі спрыяюць таму, што будынак добра глядзіцца з усіх бакоў. Чыстыя плоскасці шкла і алюмінію выдатна ўпісваюць яго ў асяроддзе парку.

Са светлага вестыбюля па невялікім праходзе, аздобленым вертыкалямі шкляных труб, напоўненых дробным бітым шклом, праходзіце ў памяшканне кафэ. Выцягнутая прастора гэтай залы завяршаецца ў глыбіні мазаікай, выкананай мастакамі Маскоўскага камбіната дэкаратыўна-афармленчага мастацтва. Тры рады паліраваных столікаў з ярка-чырвонымі крэсламі прыгожа арганізуюць інтэр'ер кафэ. Столь у кафэ — шэрага колеру — сабрана з плоскіх асбацэментных лістоў. Вось і ўсе элементы, якія ўваходзяць у архітэктурна-мастацкую арганізацыю прасторы гэтай залы. Вядучым матывам у мастацкім ладзе памяшкання стала дэкаратыўная мазаіка: адцягнены сюжэт на тэму прыроды ўтвараецца складаным ансамблем перацякаючых адна ў адну чорна-шэра-белых ліній і плоскасцей. У выніку ўзнікае амаль фантастычны вобраз першароднай прыроды.

Мастацкая цэльнасць інтэр'ера рэстарана дасягнута за кошт архітэктурных сродкаў — вялізнай плоскасці столі, набранай з перфарыраваных гіпсавых пліт светлага тону, балкона і яго столі з алюмінію, анадзіраванага ў жоўты колер, светлай паверхні паркетнай падлогі, колернай гамы сцен і багацця шкла па ўсёй сцяне, якая выходзіць на плошчу. У зале дзве свабодна пастаўленыя ўвагнутыя драўляныя сценкі закрываюць уваход у вытворчыя цэхі і служаць дадатковым сродкам архітэктурна-мастацкай выразнасці. У глыбіні залы — невялікі дэкаратыўны басейн, аздоблены аранжава-чырвонай кераміччнай пліткай. Побач — подзіюм для аркестра. Чатыры рады столікаў з мяккімі чорнымі крэсламі запаўняюць асноўную плошчу залы, пакідаючы «пятачок» для танцаў.

На ўвагнутых драўляных сценках — дэкаратыўныя роспісы са сцэнамі старадаўніх кірмашовых балаганаў. Ярка-чырвоныя фігуры скамарохаў, блазенаў, падкрэсленыя актыўным чорным колерам на паліраваным фоне светлага дуба, ажыўляюць атмасферу вялікага інтэр'ера. Можна, праўда, аспрэчваць правамернасць унясення такіх матываў у сучасную рэстаранную залу.

Невялікае памяшканне кактэйль-бара мае арыгінальную драўляную вітрыну з маляўнічымі этыкеткамі він. Цэлы феерверк агнёў льецца са столі, выкладзенай кавалачкамі бітага шкла. Гэты інтымны бар звязаны з іншымі памяшканнямі ў адзіную сістэму архітэктурна-мастацкіх варыяцый.

Удача аўтараў праекта гэтага будынка — банкетная зала на трэцім паверсе, якая трансфармуецца, дзякуючы арыгінальнай канструкцыі перагародак. Перагародкі могуць ссоўвацца «гармонікам», і памяшканне дзеліцца на дзве банкетныя залы. Пры гэтым паліраваная паверхня сторак перагародак стварае багатыя светла-колерныя эфекты, якія гарманіруюць з цёмна-чырвоным фонам сцен, чырвонай абіўкай мэблі, бліскучай паверхняю паркета. У выніку — атмасфера сапраўднай урачыстасці.

Трэба сказаць, што інтэр'еры гэтыя сваёй высакароднасцю абавязаны добрай якасці аддзелачных работ. І гэта зноў-такі заслуга аўтараў праекта — Л. Тамкоў і С. Гінзберг літаральна «днявалі і начавалі на аб'екце», пакуль ён будаваўся. Аўтарскі нагляд, як бачым, прынёс вынікі.

Стварыць інтэр'ер «пасучаснаму» паспрабавалі летась і Я. Пакаташкін, М. Навіцкі, Б. Кузьмічоў у кафэ «Грот», што ў склепе былога палаца.

Над нізкім уваходам — своеасаблівы цэхавы знак з надпісам — «Грот», масіўныя дубовыя дзверы, акаваныя жалезам, — усё гэта выклікае пэўныя асацыяцыі з мінулым. Унутры кафэ такое ўражанне расце. Масіўныя калоны ўтвараюць разам са сценамі зводы. Пад зводамі тоўстыя «столешницы» і сядзенні (дубовыя калодкі). Два каміны цепляцца чырвоным святлом за дэкаратыўнымі рашоткамі, на якіх — старадаўнія гербы. Схаванае святло быццам падкрэслівае фігуркі савы, лані, птушак. У глыбіні невялічкі вадаёмчык, аздоблены, як і скляпенні, грубым каменем. На першы погляд, быццам усё дарэчы. Мастакі хацелі, напэўна, скарыстаць у афармленні матывы народнага побыту, стварыць кафэ, разлічанае на адпачынак, на ціхую гутарку. Прыглушанае асвятленне павінна стварыць нават атмасферу нейкай таямнічасці, утульнасці, інтыму. Што ж, і такія рашэнні інтэр'ераў кафэ бываюць (ці, дакладней, здольныя быць) сучаснымі. Але прыгледзеўшыся ўважлівей, адчуваеш, быццам цябе ў нечым падманулі. Ну, канечне ж!.. На агульным старадаўнім фоне памяшкання вы раптам заўважаеце сучасныя дэкаратыўныя рашоткі круглых вокнаў са стылізаванымі галовамі, якія сімвалізуюць поры года. Такія стэрэатыпныя рэчы можна сустрэць і ў магазіне на Крашчаціку ў Кіеве, і ў абсталяванне сучаснай сталовай, рыжскім кафэ... О, а вось і сучасны акварыум на падстаўцы з груба змацаванага шкла з падсветкаю. А вось у гэтым куце — ужо зусім «мадэрная» стойка, а за ёю — ва ўсіх на вачах — абсталяванне сучаснай сталовай.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

КАНФЕРЭНЦЫЯ ТЭАТРАЗНАЎЦАЎ

22—23 кастрычніка ў Мінску, у Доме мастацтваў працавала тэатразнаўчая канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі. Канферэнцыю склікалі Міністэрства культуры рэспублікі, Беларускае тэатральнае аб'яднанне і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР.

Удзельнікі канферэнцыі заслухалі тры даклады — «Драматычныя тэатры рэспублікі за гады Савецкай улады» доктара мастацтвазнаўства Ул. Няфёда, «Музычны тэатр Беларусі за пяцьдзесят гадоў» начальніка Упраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР І. Паліводы і «Творы беларускіх драматургаў на сцэнах тэатраў братніх рэспублік краіны» кандыдата мастацтвазнаўства А. Сабалеўскага.

У творчай дыскусіі, якая разгарнулася пасля дакладаў, дзеячы тэатра, драматургі і тэатразнаўцы дзяліліся думкамі і ацэньвалі вялікі вопыт станаўлення і развіцця беларускага сцэнічнага мастацтва, якое за гады Савецкай улады дасягнула росквіту і цяпер карыстаецца славай перадавога, сапраўды народнага, партыйнага па духу мастацтва. Усебакова і патрабавальна гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі аб сучасных працэсах, што адбываюцца ў тэатры, аб неабходнасці ўмацавання сувязей паміж драматургамі, рэжысёрамі і артыстамі, выказвалі прэтэнзіі да тэатральнай крытыкі, якая пераважна даследуе мінулае і слаба распрацоўвае праблемы сучаснага развіцця сцэнічнага мастацтва. Прамоўцы спасылаліся на пяцідзесяцігадовы шлях беларускага тэатра, на плённыя традыцыі ў творчасці асобных майстроў сцэны і цэлых калектываў, падкрэслівалі, што ўсё лепшае, выпрацаванае раней, варта беражна захоўваць і развіваць, узбагачаючы сапраўды наватарскімі пошукамі.

На канферэнцыі выступілі народны артыст БССР С. Бірыла, галоўны рэжысёр Беларускага драматычнага тэатра імя Я. Коласа С. Казіміроўскі, кандыдаты мастацтвазнаўства Ю. Чурко, С. Пятровіч, Л. Акуратар (Рыга) і А. Карсакова (Масква), загадчык кафедры тэатра народаў СССР Дзяржаўнага інстытута сцэнічнага мастацтва прафесар Г. Гаян (Масква), драматургі Р. Кобец, П. Васілеўскі і А. Маўзон, заслужаная артыстка БССР Т. Аляксеева, галоўны балетмайстар Беларускага Вялікага тэатра оперы і балета А. Дадзішкіліяні, аспірант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР Ул. Халіп, галоўны рэжысёр Гродзенскага драматычнага тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Струнін, крытык Г. Колас, дырэктар інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР П. Глебка і намеснік міністра культуры рэспублікі Ю. Міхневіч.

У фае Дома мастацтваў была разгорнута вялікая выстаўка, якая адлюстроўвала шлях беларускага тэатра за гады Савецкай улады.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За плённую работу ў галіне беларускай савецкай літаратуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў намесніка галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» пісьменніка А. Ц. Бажко Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

50 год БССР — НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ЮБІЛЕЮ

ЗАЎСЁДЫ Ў ПОШУКУ

В. БОБРЫКАЎ,
намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення культуры.

Блізіцца радасная падзея — пяцідзесяцігадовы юбілей рэспублікі. З чым мы, работнікі культуры Міншчыны, ідзём да вялікага свята?

Правільна кажуць, усё пазнаецца ў параўнанні. Я пра гэта заўсёды думаю, калі бываю ў раённых цэнтрах, вёсках, калі знаёмлюся там з работай асяродкаў культуры.

Нашы работнікі культуры ўвесь час у творчым пошуку. Яны пастаянна ўдасканальваюць формы і метады работы. Вось наша Мінская абласная народная філармонія. Для дапамогі калектывам мастацкай самадзейнасці, прапаганды самадзейнага мастацтва яна арганізавала ў многіх раёнах вобласці «Святы мастацтваў». У іх праграме — вечары музыкі, кіно, тэатральнага і харавога мастацтва, дні эстрады, класічнага і народнага танца.

Па-новаму прапагандуюцца ў вобласці дасягненні народных умельцаў — разьбяроў па дрэве, скульптараў, графікаў, мастакоў, ткачых. Для гэтага арганізуюцца спецыяльныя перасоўныя выстаўкі іх работ. Такія выстаўкі былі ўжо наладжаны і мелі вялікі поспех у Крупскім, Лагойскім, Смалявіцкім, Уздзенскім і іншых раёнах.

Нядаўна ў мастацкім салон-магазіне мінчане знаёміліся з выстаўкай работ Барысаўскай студыі выяўленчага і прыкладнога мастацтваў. Мяркуецца, што такія выстаўкі будуць наладжаны ў Мінску і студыйцамі іншых гарадоў вобласці.

Папоўнілася сёлета і армія аматараў самадзейнага мастацтва. Так, створаны духавы аркестр пры Лагойскім раённым Доме культуры, хор пры Халхоліцкай сельскай бібліятэцы Барысаўскага раёна, агітмастацкая брыгада Даўгінаўскага сельскага клуба ў Вілейскім раёне, ансамбль дудароў пры Капыльскім РДК, аркестр баяністаў у Старых Дарогах. Вельмі цікава заявіў пра сябе новы агітэатр, рэпертуар якога цалкам складзены з твораў Якуба Коласа. Ён створаны ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна дырэктарам музычнай школы Ул. Тараном. У рабоце тэатра ўдзельнічаюць мясцовыя настаўнікі, калгаснікі, школьнікі старэйшых класаў.

З вялікім творчым напружаннем працуюць артысты Слуцкага народнага тэатра. У юбілейныя дні яны пакажуць два новыя спектаклі: «Трывожнае шчасце» К. Фіна, «Ірынка» К. Чорнага. Дзве прэм'еры — «Машаньку» А. Афінагенава і «Выбачайце, калі ласка» А. Макаёнка — рыхтуе Старадарожскі народны тэатр. Народны тэатр Маладзечанскага гарадскога Дома культуры пакажа спектаклі па п'есах В. Катаева «Дзень адпачынку» і К. Крапівы «Партызаны».

У нас многа і іншых добрых калектываў, што заваявалі любоў і падзяку гледача. Сярод іх варта назваць адзіны ў рэспубліцы сельскі мужчынскі народны хор у вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага раёна, Івянецкі харэаграфічны ансамбль, Лебядзеўскую народную харавую капэлу.

Зараз у вобласці праводзяцца юбілейныя агляды мастацкай самадзейнасці. Яны прайшлі ўжо на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, а таксама ў Слуцкім, Клецкім, Мінскім, Стаўбцоўскім, Капыльскім, Пухавіцкім і іншых раёнах. Амаль ва ўсіх гэтых раёнах адзначана далейшае павышэнне майстэрства калектываў мастацкай самадзейнасці і асобных выканаўцаў, павялічылася колькасць удзельнікаў гурткоў. Парадавалі нас таксама вынікі семінара-конкурсу маладых вакалістаў, які быў праведзены абласным Домам народнай творчасці. Выяўлена многа здольнай моладзі, якая будзе добрым папаўненнем для гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Праходзяць ужо і абласныя агляды. Яны праводзяцца не так, як у мінулыя гады, а па кустах. Такія занальныя агляды прайшлі ўжо ў Чэрвені і Слуцку, куды з'язджаліся артысты некалькіх суседніх раёнаў.

Мне часта даводзіцца гутарыць з работнікамі клубаў, бібліятэк, музеяў, паркаў. І кожны раз радуешся настрою людзей, іх гордасці за даручаную справу, імкненню да ўсяго падыходзіць творча, з выдумкай і ініцыятывай. Можна прывесці шмат добрых прыкладаў гэтага.

У Слуцкім гарадскім Доме культуры адкрыты музычны лекторый. Арганізаваны клуб «Ветразь» для вучняў старэйшых класаў. А ў Валожынскім раёне — ва Узбалоцкім, Дварэцкім, Румскім сельскіх клубах добра пастаўлена прапаганда палітычных і прыродазнаўча-навуковых ведаў, укараненне новых звычаяў і абрадаў.

Праведзены цікавыя эстафеты, цыклы пенінскіх і юбілейных чытанняў на Уздзеншчыне. Варта адзначыць і цікавую стэндавую агітацыю, тэматычныя вечары, канферэнцыі ў сельскіх клубах і чытальнях, дамах культуры Чэрвеньскага раёна.

А як не сказаць аб рабоце нашых бібліятэк.

У юбілейным годзе бібліятэкі Міншчыны працуюць пад дэвізам: «Багацце бібліятэк — народу». Сутнасць гэтага дэвізу асабліва яскрава пачынаеш уяўляць, калі знаёмішся з работай Крупскай раённай бібліятэкі. Яе работнікі робяць усё, каб захапіць людзей вялікай любоўю да кнігі, да роднага краю, выхаваць пачуццё гордасці за сваю рэспубліку, што спраўляе сёлета залаты юбілей.

Вялікую работу па патрыятычным выхаванні працоўных праводзяць нашы музеі. Зараз музеі-ветэраны ў Маладзечна, Слуцку, Барысаве рыхтуюць новыя экспазіцыі, прысвечаныя 50-годдзю рэспублікі. Новымі экспанатамі папаўняюцца экспазіцыі двух адкрытых сёлета музеяў баявой і працоўнай славы ў Любані і Мядзелі.

...На такой аптымістычнай ноце можна было б і закончыць сённяшні расказ. Але, мне здаецца, нельга абысці маўчаннем шэраг праблем, якія нас хвалююць.

Неяк так склалася, што на Міншчыне атрымала асаблівае развіццё харавое мастацтва. Затое іншыя жанры, скажам, харэаграфія, у нас адстаюць. У апошні час прымаюцца меры, каб выправіць гэтае становішча. У прыватнасці, абласны Дом народнай творчасці замацаваў за самадзейнымі танцавальнымі калектывамі 12 навучэнцаў аддзялення народнага танца Мінскага харэаграфічнага вучылішча. На «нізы» паслана адпаведная метадычная літаратура і г. д.

Але гэта, вядома, не выйсце са становішча. На маю думку наспела неабходнасць пры абласным Доме народнай творчасці, пры некаторых буйных дамах культуры арганізаваць харэаграфічныя студыі. Астаноўка за сродкамі і за кадрамі. Асабліва за кадрамі. Гэта наша вузкае месца. З 3445 культасветработнікаў толькі трэцяя частка мае вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. Астатнія — гэта або аматары, або выпадковыя людзі.

У нас ёсць прэтэнзіі да Магілёўскага і Гродзенскага культасветвучылішчаў — аснoўных пастаўшчыкоў кадраў для культасветустаноў рэспублікі.

Справа ў тым, што да нас часта прыходзяць упадкоўваюцца на работу выпускнікі гэтых вучылішчаў, у дыпломе якіх стаіць — культарганізатар. Здаецца, добра! Але пачынаеш цікавіцца, што таварыш умее, і аказваецца — толькі кіраваць. Вось калі дасі яму хормайстра, харэографа, рэжысёра — дык тады ён арганізуе клубную работу. Сам ён ніводнай з гэтых спецыяльнасцей не валодае. І вось накіруй такога «спецыяліста», скажам, у калгасны клуб, дзе ўсё трэба пачынаць з азоў, вучыць людзей спяваць, іграць, танцаваць — можна ўявіць, якая з яго там будзе карысць.

Кожны дзень набліжае нас да слаўнага юбілею. Як і ўсе працоўныя Міншчыны, культармейцы вобласці зробяць усё, каб сустрэць вялікае свята рэспублікі новымі поспехамі.

Да твайго юбілею, РЭСПУБЛІКА!

МАШТАБНЫ ТВОР

ПЕРШЫЯ ЎРАЖАННІ

Як толькі мы прыгадваем імя кампазітара Мікалая Ільіча Аладава, у нашай памяці ажываюць шматлікія старонкі музычнай літаратуры, створанай гэтым няўрымслівым і заўсёды маладым мастаком-шукальнікам. Грамадскасць ведае творчасць М. Аладава вельмі добра. Скарбніца сучаснай беларускай музычнай культуры папаўнялася і папаўнечца яго цікавымі, змястоўнымі, разнастайнымі ў жанравых адносінах творамі. Ці ж малы здабытак—дзевяць сімфоній, сімфанічныя паэмы, уверцюры, сімфаньета, харавыя і сольныя творы для спевакоў і опера «Андрэй Касценя», што чакае свайго сцэнічнага ўвасаблення!..

21 кастрычніка ў зале Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбылося першае выкананне новай—Дзевятай—сімфоніі Мікалая Аладава. Гэты твор наш старэйшы кампазітар, якому хутка будзе восемдзесят, прысвяціў знамянальнай даце—50-годдзю Савецкай Беларусі і Кампартыі рэспублікі.

Відаць, аўтары літаратурнага каментарыя да сімфоніі справядліва заўважылі, што праграмную задуму аўтара можна расшыфраваць наступным чынам—няма больш абяздоленай Беларусі, беларускі народ ганарыцца сваёй свабоднай краінай, роўнай сярод роўных савецкіх рэспублік. Праўда, такое вызначэнне музычнага зместу трохі агульнае. Мушу сказаць, што я лічу любы пераказ музыкі вельмі прыблізным, і тое, што сказана ў праграмцы канцэрта пра Дзевятую сімфонію М. Аладава, таксама дае толькі агульнае ўяўленне пра твор.

На маю думку, Мікалай Аладаў яшчэ раз пацвердзіў, што ў яго ёсць сваё непаўторнае кампазітарскае «я». На канцэрце слухачы зноў пераканаліся ў арыгінальнасці творчага почырку кампазітара, у непаўторнасці яго майстэрскіх распрацовак і глыбіні задумы. Гэта мы добра ведаем і па ранейшых яго творах, па такіх, як Трэцяя, Пятая, Сёмая і, мабыць, асабліва Восьмая сімфоніі. Рэпутацыя сталага майстра ў М. Аладава даўняя. І кожным новым творам ён сведчыць пра тое, што яго творчы дыяпазон—неабсяжны.

Дзевятая сімфонія складаецца з чатырох частак, выразна кантрастных і, адначасова, аб'яднаных агульнай ідэяй і тэматычным матэрыялам. Як і ва ўсіх лепшых партытурах М. Аладава, мы сустракаем тут тыповыя «аладаўскія» рытмы і «аладаўскую» схільнасць да скерца, яго славутыя нечаканыя замаруджванні і такія ж нечаканыя паскарэнні. Уласцівае гэтаму мастаку вострае пачуццё сімфанізму, як метаду раскрыцця музычных вобразаў у іх развіцці, яскрава раскрылася і ў Дзевятай сімфоніі. Твор гучыць маштабна, дынамічна, захапляе хараством нюансаў. Мне хочацца асабліва падкрэсліць тое, што сімфонія прасякнута беларускім народным меласам, убірае ў сваю музычную тканіну маляўнічыя інтанацыі нацыянальнай песеннасці. І гэта развіваецца ў аркестры вельмі натуральна, у кожнай частцы па-свойму.

Слухачы былі ўзяты, як кажуць, у палон ужо з першай часткі, якая пачынаецца гукамі звароў, — вось яна дакастрычніцкая Беларусь. Музыка абуджае плённы асацыятыўны роздум, і публіка паглыбляецца ў настрой твора, атмасферу гістарычных зрухаў.

У аркестры вылучаюцца інструменты, якім на пэўны час аддаецца роля салістаў, — габой, скрыпка. Цікава, што кампазітар смела і ўпэўнена распрацаваў характар народнага «найгрышу» для кожнага з іх. Сардэчна, з лірычнай усхваляванасцю пачынае гучаць пераасэнсаваная кампазітарам «Рэчанька».

А потым М. Аладаў шчодра дэманструе рытмічнае багацце сваёй палітры. Валторны, трубы, літаўры і малы барабан уносяць у музычнае развіццё свае акцэнты. Вялікай удачай кампазітара стала асноўная частка першага раздзела—санатнае алегра. Рашучасць і драматычны аптымізм вызначаюць яе музыку. Тут і закладзена зерне тэматычнага матэрыялу ўсёй сімфоніі.

Другая частка—гэта вялікі лірычны расказ. У ім чаруюць сольныя эпізоды. Мабыць, калі мы паслухаем сімфонію не адзін раз, можна будзе больш падрабязна пісаць пра цудоўнае сола скрыпкі (дарэчы, шырока скарыстанае ў партытуры), сола кларнета, англійскага ражка, віяланчэлі. Не, аўтар не дэманструе сваё віртуознае майстэрства, ён звяртаецца да сольных эпізодаў, бо імкнецца падкрэсліць свае думкі і раскрыць настрой.

І гэтага ён дасягае упэўнена — рэчытатыўны характар эпізодаў (своеасаблівасць дыялогаў), як амаль і заўсёды ў М. Аладава ў скерца, нясе з сабой дасціпныя ноты, яркія аркестравыя фарбы.

У трэцяй частцы сімфоніі прываблівае незвычайная вастрыня гарманічнай пабудовы музыкі. Пра тое, як уладарна вядзе М. Аладаў праз стыхію музычнай мовы драўляныя інструменты, можна было б напісаць многа. Ды толькі ж гэта —музыка: яе трэба слухаць, а калі знаходзішся пад першым уражаннем, пераказваць яе немагчыма.

Драматызм і шматграннасць народнага жыцця знайшлі ў сімфоніі вельмі ўдумлівае і натхнёнае адлюстраванне. Падкрэслю—не ілюстрацыю, а менавіта творчае, сапраўды музычнае, вобразнае адлюстраванне. Гэты драматызм і гэтая шматграннасць праходзяць праз усе старонкі партытуры.

Фінал—зноў званы. Быццам бы тыя ж, але прыслухаемся: не, гэта ўжо сапраўдная, хвалюючая чалавечую душу ўрачыстасць. Зноў-такі я дазволю сабе сказаць—тут пануе «аладаўская» святочная музыка. Здаецца, слухаеш шматгалосы хор, здольны перадаць пералівы шчодрага інтэлекту і эмацыянальны напал людскіх хваляванняў.

Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі В. Катаева выконваў твор з вялікім уздымам, адчуваючы ўсё багацце партытуры. З салістаў адзначу першую скрыпку (заслужаны артыст БССР С. Асновіч): як і кожны з салістаў у аркестры, гэты інструмент далікатна «браў слова», каб выказаць тое, што напісаў кампазітар, раскрыць патрэбныя для агульнага гучання твора матывы праграмнай музыкі.

Поспех! Я сказаў бы нават—безумоўны поспех, хаця і агаворваюся, што адразу пасля таго, як ты пачуў такі маштабны твор, выказваць ацэнкі заўчасна. Сёлета ў снежні на юбілейным пленуме Саюза кампазітараў БССР мы зноў пачуем Дзевятую М. Аладава. Тады ў кожнага з калег кампазітара, у музыказнаўцаў і слухачоў будзе большая магчымасць грунтоўна прааналізаваць складаны праграмны твор, які сведчыць пра тое, што адзін з прадстаўнікоў беларускіх кампазітараў старэйшага пакалення актыўна і плённа працуе, працягвае творчыя пошукі ў галіне сучаснага адлюстравання галоўных тэм нашага часу. Гэты мой водгук на канцэрт трэба ўспрымаць як дадатак да тых шчырых апладысментаў, якімі быў заслужана ўзнагароджаны Мікалай Ільіч пасля таго, як адгучалі апошнія гукі яго Дзевятай сімфоніі.

Генрых ВАГНЕР,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

У БЕЛАРУСКІМ дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы адбылася прэм'ера спектакля па п'есе Ільі Штэмлера «Гросмайстарскі бал». Пастаноўшчык спектакля Фёдар Шэйн, рэжысёр Галіна Уладамірская, мастак Барыс Герлаван, песні кампазітара Сяргея Картэса на словы Уладзіміра Бойкі.

На здымку вы бачыце сцэну са спектакля. У ролі Ніны Л. Давідовіч, Піліп Круглы — А. Мілаванаў.

Фота А. КАЛЯДЫ.

ГОМЕЛЬСКІЯ НАВАСЕЛЛІ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

Азірнуўшыся, бачыш другія дзверы, апрацаваныя сучаснымі шклоблокамі.

Задумаўшы сказаць нешта новае на аснове скарыстання асацыяцый з традыцыйным, аўтары не здолелі зрабіць інтэр'ер цэласным. Эклектыка традыцыйных і сучасных форм і рашэнняў прывяла да таго, што цікавая задума засталася не завершанай.

Шмат працуюць гомельскія мастакі над афармленнем інтэр'ераў магазінаў. Правільнае разуменне прызначэння і эстэтычных патрэб гэтых найбольш дэмакратычных грамадскіх інтэр'ераў адчуваецца і ў афармленні магазінаў «Адзенне» (па праспекце Леніна), і ў «Іпуці» (вуліца Свярдлова), і ў рэканструяваным «Старце» (на Прываксальнай плошчы), і ў «Чаравічках» (праспект Перамогі). Мастакі праявілі багата вынаходлівасці, дамагаючыся разнастайных выяўленчых эфектаў, скарыстоўваючы дрэва, шкло, фактурную апрацоўку атынкоўкі, спалучаючы розныя аб'ёмы і плоскасці. Не ўсё ў гэтых інтэр'ерах бездакорнае, але адно несумненна — многае сведчыць аб правільным кірунку творчага пошуку.

Найбольш новы — інтэр'ер прадуктовага магазіна «Космас» на праспекце Леніна (архітэктар Стукачоў, мастакі Б. Кузняцова, В. Фралоў, А. Осіпава, С. Мельнік). Гэты магазін «пачынаецца» ўжо на вуліцы — вітрыны спалучаюць унутраную прастору са знешняй. Інтэр'ер пакідае прыемнае ўражанне. Стрыманая колерная гама, светлыя шэра-белыя тоны. Абсталяванне размешчана рацыянальна. Хаваючы старыя прапорцыі залы (будынак адносіцца да 1956 г.), архітэктар спраектаваў падвесны казырок з устаўленымі ў яго свяцільнікамі. Казырок праходзіць над гандлёвай часткай. Ён здаецца зусім лёгкім, спрыяе пластычнаму адзінству інтэр'ера. Масіўныя калоны аздоблены белай і светла-зялёнай керамічнай пліткай з устаўкамі чорных. Колерам і фактурай выдзелены «рабочыя зоны»: бакалейны аддзел — сценка з прамавугольных люстэркаў, малочны — з белага кафелю. Выразна вырашаны невялікі кафетэрый у левай частцы памяшкання. Тут калоны аздоблены чорнай пліткай з украпленнямі белай, за імі дэкаратыўная металічная рашотка закрывае падсобнае памяшканне. Тут жа — мазаічнае пано «Гомель» на тарцавой сцяне — жыццярадасны і маляўнічы «дыван» са знаёмымі сілуэтамі горада.

У мяса-малочным аддзеле магазіна — яшчэ адна мазаіка: на тэмы космасу. Але... дазвольце: космас і раптам... парасчыя ножкі і мясны фарш... Неяк не надта вяжацца. Пачуццё меры яўна здрадзіла аўтарам. Зусім не абавязкова, каб кампазіцыя адпавядала назве магазіна, а калі ўжо адпавядае, дык месца для яе павінна быць выбрана больш дакладна. Зрабіўшы стойку на фоне мазаікі «Гомель», мастакі тым самым парушылі ўспрыняцце гэтай кампазіцыі. І яшчэ адзін момант у сувязі з тэмай гэтай мазаікі. Характэрныя рысы горада мы бачылі раней і ў зграфіта будынка Аблпраекта, і ў рэстаране «Сож»... А ў якім інтэр'еры заўтра ўбачым знаёмыя сілуэты?..

Па волі заказчыка былі пастаўлены недарэчныя нікеляваныя стойкі, якія аддзяляюць кафетэрый ад залы — у прыгожы ансамбль раптам уціснулася яўная недарэчнасць, якая сведчыць пра густ «гаспадароў» не з лепшага боку.

Гэта добра, што так упрыгожваюцца ў Гомелі магазіны, а вось што датычыць іншых аб'ектаў... У магазінаў і кафэ багаты «заказчык». Новыя ж школы і бальніцы, новыя карпусы інстытутаў педагагічнага і інжынераў чыгуначнага транспарту засталіся па-за ўвагай мастакоў.

Нядаўна Гомель атрымаў яшчэ адзін інтэр'ер — новы будынак аэрапорта. Стары тыпавы праект быў «падпрацаваны» Л. Тамковым. Яму ўдалося знайсці той маштаб, тыя прапорцыі і рытмічны лад, якія больш адпавядаюць сучаснасці. Унутраны ж выгляд будынка выклікае супярэчлівыя пачуцці. Тут поўны «сучасны набор» — і драўляныя рэйкі, і падвесная столь, і адмысловая апрацоўка сцен, і, нарэшце, сучасная мэбля. А завершанага архітэктурна-мастацкага вобраза не атрымалася. Не прадуманы па прапорцыях і не дастасаваны да аб'ёмна-планіровачнай структуры памяшкання стойкі для білетных кас, пошты, афармлення дакументаў. Падвесная плоскасць асвятлення непрапарцыянальная і занадта важкая. Абсталяванне буфета — старамоднае і цяжкае. «Шыльда» рэстарана — нібы з «забягалаўкі» пяцідзесятых гадоў. Такі ж і выгляд рэстарана — яго не ратуюць ні рэйкі, ні «набрызг», ні шторы. Не прадумана размяшчэнне інфармацыі — расклад руху самалётаў вісіць проста на стойцы касы. Тут жа ад рукі напісаныя «элементы інфармацыі»... Можна ўбачыць тут і фікус у безгустоўнай падстаўцы, і без усякай сістэмы пастаўленыя крэслы. Службовыя памяшканні, пакоі адпачынку зроблены таксама наспех.

Разглядаючы апошнія работы гомельскіх архітэктараў і мастакоў, мне хацелася паказаць, што ўжо сёння пры афармленні інтэр'ераў у горадзе ставяцца новыя задачы і вырашаюцца яны досыць смела і цікава. Мастакі глыбей разумеюць законы афармлення памяшканняў, ім пад сілу маштабныя работы ў галіне дэкаратыўна-манументальнага мастацтва. Трэба толькі, каб тое, што створана ў інтэр'еры ў выніку творчай садружнасці архітэктараў і мастакоў, добра навучыліся разумець гаспадары гэтых памяшканняў. Трэба, каб аўтары інтэр'ераў актыўней праводзілі б аўтарскі нагляд і не дапускалі б з'яўлення «дробязей», якія псуюць уражанне ад цэлага.

ПЕСНЯ ВАБІЛА ЗМАЛКУ...

Першы раз я ўбачыў яго на сцэне Палаца культуры прафсаюзаў у ролі бандыта Спарафучыле ў оперы Вердзі «Рыгалета». Потым, калі мы пазнаёміліся бліжэй, Мікалай Затонец запрасіў мяне да сябе на кватэру.

...Слова за слова — разгаварыліся.

Неўзабаве ён дастаў з шафляды і выклаў на часопісны столік, набытыя за час актыўнага «пакланення» музе мастацтва памятныя падарункі, лаўрэацкія дыпломы, дзве Ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета БССР, цэлы стос іншых грамат, здымкі са спектакляў, запрашальныя білеты, кароткія газетныя інфармацыі — усё, што напамінае аб колішніх выступленнях на сцэне ў сябе ў Беларусі, на гастролях у Маскве і за мяжою, у Польшчы...

Род Затонцаў здаўна славіцца галасістасцю. Стары Цярэнцій і цяпер, у свае 78 год, добра «чуе» мелодыю.

Часам ён як бы жартуе над такой «слабасцю»» Затонцаў.

— От якое дзела выходзіць: пяяў жа я ў царкоўным хоры? Пяяў! Выходзіць, богу служыў, так? Але і трошачкі не верыў яму, хоць, помню, і пужалі царкоўнікі, бытта ўсявышні пад старасць усе грахі ўспамяне... А Колька мой, бывала, прыбяжыць у сабор і слухае... А мы там чаго толькі не пяялі—і Моцартавы месы, і Баха «Высокую месу», і Бетховена «Урачыстую месу»—усё мы пяялі...

А то ж, бывала, калі зберымося ў нас дома—во ўжо дзе канцэрты! А мы так пяялі: я—тэнарам, брат мой Лука—барытонам, а Колька —басам... А там ужо, хто ахвочы, падгалосвалі. Вось вам і хор! Бывала і сваю душу забавіш, і людзей парадуеш... А цяпер чаму не пець: і палацаў такіх набудавалі, і дамоў культуры... Пяюць людзі, добра пяюць. І ўсё цяпер песні спрыяе. І радзіва, і целявізар, і кацёлкі гэтыя самыя...

— Магнітафоны? — смяецца сын.

— Во-во... Але, дзякуй богу, што хоць пра чорнага ката перасталі... А колькі добрага, наськага можна было б пець! І ёсць жа што!

Уніклівы стары. «Падкалоў» нас як мае быць і чамусьці раптам адышоўся, быццам гэта і не ён з намі размаўляў, не ён сказаў, што трэба перш за ўсё «наськае» пець.

І неяк незаўважна, менавіта гэтым рэчышчам і пацякла наша размова.

Багаты і разнастайны рэпертуар спевака! Мікалая Цярэнцьевіча перш за ўсё цікавяць такія песні, як «Бухенвальдский набат» Мурадэлі, «Я вернусь к тебе, Россия» Калманоўскага і «На безымянной высоте» Баснера, «Хотят ли русские войны» Калманоўскага і «Памяць сэрца» Лучанка. Ёсць у яго рэпертуары таксама песні пра герояў грамадзянскай і Айчыннай войнаў, рускія народныя песні «Утёс», «Дубинушка», «Вдоль по Питерской», арыі з опер рускіх і зарубежных кампазітараў: старога цыгана (опера «Алека» Рахманінава), мельніка («Русалка» Даргамыжскага), Сусаніна («Іван Сусанін» Глінкі), Базіліо («Севільскі цырульнік» Расіні), барона Дзюфоль («Травіята» Вердзі) і генерал-губернатара Мураўёва ў оперы Лукаса «Кастусь Каліноўскі».

Гэтая, трэба думаць, не апошняя партыя, была асабліва значнай для выканаўцы. Ён знайшоў адпаведныя інтанацыі, яркія фарбы, каб паказаць царскага служку — душыцеля народнага паўстання 1863 года — жорсткім, бяздушным чалавекам, паслухмянай машынай цара-сатрапа.

Гэта быў невыпадковы ўзлёт, не часовая ўдача самадзейнага спевака, а сур'ёзнае творчае пранікненне ў сутнасць характару гістарычнай асобы. Яно і прынесла выдатны поспех. За гэтую партыю артыст удастоены звання лаўрэата Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.

— Як бачыце, ацэнка работы высокая, — кажа Мікалай Цярэнцьевіч. — А гэта ўжо, разумееце, да многага абавязвае. Мы, студыйцы, не чакалі паблажак, не заспакойвалі сябе тым, што студыя аматарская, самадзейная... Калі ўжо інсцэніраваць оперу, дык пасапраўднаму. Іначай і не цікава было б.

Мікалай Цярэнцьевіч між іншым расказаў, як у Маскве пасля паказу оперы «Кастусь Каліноўскі» многія слухачы проста-такі спрачаліся з кіраўніком студыі народным артыстам БССР Мікалаем Мікалаевічам Сярдобавым: маўляў, гэта не самадзейнасць, а артысты — сапраўдныя, прафесійныя...

— Прыемна было такое чуць,— прызнаецца Мікалай Цярэнцьевіч, — бо дома да нас, калі гаварыць шчыра, адносіліся тады крыху не так. Усё трымалася на нашым энтузіязме... Былы дырэктар палаца не любіў оперу. Бачыце, з эстрадай яму было менш клопату...

— Спадзяюся, цяпер іначай ўсё?

— Цяжкасці ёсць, канечне... Але цяпер іх, здаецца, стала лягчэй адольваць. Дырэкцыя робіць усё, каб наладзіць работу студыі. А наш кіраўнік Мікалай Мікалаевіч увесь свой вольны час праводзіць з намі на рэпетыцыях. Ён вельмі многа робіць для студыі, у яго энергіі і мы сваё натхненне чэрпаем...

Праца, праца, праца... І Мікалай Цярэнцьевіч прывучаў сябе да яе змалку, выхоўваў самадысцыпліну, шліфаваў майстэрства ігры на домры, мандаліне, балалайцы, гітары, гармоніку. Нават у школьныя гады без яго ў Рэчыцы не абыходзіўся ніводзін аркестр народных інструментаў, без яго і школьны хор быў не хор.

Першыя педагогі па музыцы і спевах — гэта, канечне, ягоны бацька Цярэнцій і дзядзька Лука Захаравіч. Яны памагалі цікаўнаму хлопчыку разабрацца ў нотнай грамаце, заахвочвалі вучыцца музыцы. Аднак музыка з яго не выйшаў. Яму хацелася спяваць. Песня запаланіла юначую душу, зачаравала назаўсёды. Першы раз як спявак-саліст выступіў ён у 1938 годзе. То была песня аб юным герої грамадзянскай вайны. Мікалай Цярэнцьевіч не помніць ужо слоў песні. Але той гром воплескаў, якімі ўзнагародзілі яго слухачы, і сёння стаіць у вушшу...

Разам з народным хорам Рэчыцкага раёна ён удзельнічаў у 1940 годзе ў Першай дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Хіба можа забыць ён, колькі хваляванняў давялося перажыць на заключным канцэрце дэкады ў Вялікім тэатры оперы і балета, на ўрадавым прыёме ўдзельнікаў дэкады ў Крамлі...

Ён вучыўся ў медінстытуце, але песні не кідаў. А ў час Айчыннай вайны пайшоў добраахвотна ў армію. Служыў у групе Савецкіх войск у Іране. Выступаў у канцэртах як перад савецкімі салдатамі, так і перад беднякамі іранскіх вёсак. Удзельнічаў у аглядах армейскай мастацкай самадзейнасці. На апошнім годзе службы спяваў у армейскім ансамблі песні і танца.

Пасля вайны ён зноў студэнт медінстытута, зноў актыўны ўдзельнік інстытуцкай самадзейнасці. Ніхто не скажа, што было лёгка спалучаць вучобу і служэнне музе, але тая апантанасць, якая так характэрна для яго сёння, уласціва была яму і тады. Будучы на пятым курсе, ён паспяхова выступае на святочным канцэрце — першым канцэрце ў тэатры оперы і балета.

А потым былі паспяховыя выступленні мужчынскага квартэта пры медінстытуце, які стварыў Мікалай Цярэнцьевіч, шматлікія сольныя выступленні і выступленні ў складзе хораў медработнікаў у гады работы...

Мікалай Цярэнцьевіч і зараз па-ранейшаму аддадзены прафесіі ўрача і гэтак жа верны мастацтву. І няма ў гэтым ніякай раздвоенасці асобы, імкнення збавіцца ад адной прафесіі і набыць другую. Тут іншае — багацце натуры, непераадольная цяга да мастацтва. Яна, гэтая цяга, як ён сам гаворыць, засталася ў спадчыну ад бацькі...

Калектыў народнай опернай студыі, у якой зараз працуе М. Затонец поўны энергіі і творчых сіл. У гэтым можна ўпэўніцца, сустрэўшыся з іншымі студыйцамі — інжынерам Барысам Паляковым ці тавараведам Дзіянай Угоднікавай, педагогам Фаінай Аўруцінай ці партыйным работнікам Ірынай Жыбрык... Кожны з іх сур'ёзна «захварэў» оперным мастацтвам і кожны не ўяўляе сябе без яго.

Я ж расказаў тут толькі аб сустрэчы з Мікалаем Затонцам. Расказ гэты, канечне, далёка не поўны... Пра чалавека, які амаль трыццаць год выступае на сцэне як самадзейны артыст і які ўжо мае свае творчыя здабыткі, можна сказаць многа добрых слоў. Я адчуваю, што з Мікалаем Цярэнцьевічам у нас яшчэ шмат сустрэч наперадзе і, канечне, многія з іх адбудуцца ў шчаслівыя часы будучых прэм'ер.

А. МАСАРЭНКА.



ЛЕНІНІЯНА КАЛЕКЦЫЯНЕРА

Рыгора Лукіча Базылёва жыхары Оршы ведаюць як заўзятага калекцыянера-нумізмата. У яго багаты збор рэдкіх значкоў, манет, медаляў, жэтонаў з 50 краін свету.

Гордасць калекцыянера — яго ленініяна, больш двухсот значкоў і медаляў, прысвечаных Ільічу і яго баявым паплечнікам, а таксама дакументы і фотаздымкі, якія расказваюць аб гісторыі Оршы. Да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра калекцыянер мяркуе папоўніць сваю калекцыю. Дапамогуць яму ў гэтым сяброўскія сувязі з многімі калекцыянерамі краіны.

А. ПАЛОНСКІ.

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

ЗАДУМЫ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА

Калі заходзіш у майстэрню Яўгена Міхайлавіча Харытоненкі, адпадае ўсякая патрэба пытацца пра яго любімую тэму ў мастацтве. Усё адразу ясна, як толькі паглядзіш на акуратна развешаныя работы ў простых і строгіх рамах: дзіцячыя твары, задумлівыя і бадзёрыя, хлопчыкі і дзяўчынкі — дзеці горада і вёскі. У кожным з гэтых вобразаў — часцінка жыцця і сэрца мастака.

— Маляваць дзяцей вельмі складана, — гаворыць Яўген Міхайлавіч. — Як толькі дзіця страціць цікавасць да таго, што робіць мастак, адразу пачынае сумаваць, замыкацца ў сабе. У такім разе можна дабіцца хіба што партрэтнага падабенства. А гэта не так цікава ды і звужае магчымасці партрэта як жанру. Таму заўсёды даводзіцца неяк падахвочваць дзяцей—вось тады і ўдаецца данесці да гледача характар, складаны ўнутраны свет нашага маленькага сучасніка.

Яўген Міхайлавіч расказвае аб нараджэнні задум сваіх карцін, аб пошуках мастацкіх сродкаў, аб доўгім шляху да вырашэння вобраза.

Вось адна з апошніх работ—«Партрэт жанчыны ў чорным». У твора цэлая гісторыя—шмат эскізаў, накідаў, варыянтаў кампазіцыі. Глядзіш на іх і бачыш, як паступова задума набывала ўсё больш дакладныя формы.

Міжволі прыцягваюць увагу невялікія эскізы, выкананыя ў манеры не зусім уласцівай Харытоненку. Група людзей, мяркуючы па ўсім, рабочых-сталяраў.

— Так, гэта сталяры!

Яўген Міхайлавіч здымае пакрывала з вялікага палатна. На ім таксама група, але ўжо больш дэталёва намаляваная з намечанымі характарамі, трапна знойдзенымі характэрнымі позамі і жэстамі.

— Гэта мая новая работа, якую я прысвячаю слаўнаму рабочаму класу і юбілею нашай рэспублікі. Я назваў яе «Сталеліцейшчыкі трактарнага». Яшчэ не зусім выпісаны фон, не знойдзены многія дэталі. Дзеючымі асобамі карціны будуць жывыя людзі—ударная камуністычная брыгада сталеліцейнага цэха Мінскага трактарнага завода. Працую і над асобнымі партрэтамі членаў брыгады. Рыхтую карціну да рэспубліканскай выстаўкі, прысвечанай пяцідзесяцігоддзю БССР і КПБ.

Мае бліжэйшыя задумы—стварыць серыю партрэтаў або групавы партрэт мінскіх партызан.

Я. БЯЛЬКЕВІЧ.

АЛЬБОМЫ-ЛЕТАПІСЫ СЕЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ

У чытальні Крупіцкай сельскай бібліятэкі Мінскага раёна на спецыяльным століку ляжаць тры альбомы-летапісы пра калгас «Новы быт» і эксперыментальную базу «Анопаль».

Першы альбом прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. У ім 130 здымкаў з гісторыі гэтых гаспадарак. Пра арганізацыю калгаса «Новы быт» расказвае першы яго старшыня Кузьма Адамавіч Шарапа. З цікавасцю чытаецца нарыс пра мужную лётчыцу з вёскі Закружжа Веру Фёдараўну Ламака. Яшчэ ў 1938 годзе яна разам з Палінай Асіпенка і Марынай Расковай зрабіла геераічны пералёт зд Севастопаля да Архангельска. У час Вялікай Айчыннай вайны Вера Ламака камандавала авіяцыйным палком.

Гартаем другі альбом. Ён прысвечаны ўдзельнікам грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ветэранам калгаснага ладу. Аб геераічных паходах Першай коннай расказвае былы будзёнавец Аляксандр Лук'янавіч Ласкевіч.

Трэці альбом названы «Нашы землякі». У ім змешчаны фотаздымкі і расказы аб перадавіках сельскай гаспадаркі і калгасніках, узнагароджаных ордэнамі.

Г. ЛЯНКЕВІЧ.

З КНІГІ ПРА ЗЕМЛЯКОЎ

Еўдакія ЛОСЬ

АД ІМЯ МАІХ МУРАГОЎ...

Расказвае Пётр Эдуардавіч УРУБЛЕЎСКІ

— У сорак трэцім годзе шаснаццатага чэрвеня фашысты прарвалі абарону партызан ля Пышна, і партызаны змушаны былі адступаць на захад, у лясы. Той дзень яны ішлі праз нашу вёску Мурагі. Нашы людзі пыталіся ў іх, дзе можна ўратавацца ад немцаў, ды партызаны адказвалі, што і самі яшчэ не ведаюць, дзе затуляцца. І мы рашылі падвечар пагрузіцца на калёсы і падацца следам, але ад'ехаліся ад дому недалёка. Вярнуліся да знаёмых мясцін, спыніліся між лясістых узгоркаў каля возера. І так рашылі ўсёй вёскай. Калі даехалі да месца, стала ўжо цёмна. Скаціну пакінулі каля прыстані, а самі падаліся між узгоркаў глыбей у лясок.

Ноч, канечне, ніхто з нас не спаў, і бачылі, як гарэла наша вёска. А раніцай, калі сонейка ледзь паднялося, бацька сказаў мне нарваць травы скаціне. І я пайшоў. Пакуль рваў траву і даваў карове, часу прайшло, лічы, гадзіны са дзве. І от, калі даваў скаціне, пачуў я аўтаматныя чэргі ў тым баку, дзе засталася наша сям'я і ўсе суседзі.

Я пабег туды. Не дабег метраў дваццаці да палянкі. Бачу, стаяць усе нашы, а вакол немцы. А пасярод яма жаўцее. І раптам — стрэлы. Адзін гітлераўскі кат страляе кароткімі чэргамі, а другі кінжалам размахвае. Гэта я пазней здагадаўся, што ён недабітых дарэзваў. Стогн, плач стаіць... Страшна мне стала. Кінуўся я ў лес, за вёску Чарнаручча. У лесе цэлы дзень прабыў і пераначаваў.

А пад раніцу мне стала вельмі балюча, і я пайшоў назад, дзе засталіся родныя, каб паглядзець, што там. Думалася, што, можа, апроч мяне хто жывы застаўся... Іду па сцежачцы, што з Мурагоў на Заазер'е, аж раптам бачу — немец стаіць. Зглядзеў мяне, выхапіў пісталет з-за халявы, крычыць: «Ком, ком, партызан!» Проста на мяне дула пісталета... Я спужаўся, падумаў, што адразу заб'е. А ён зноў зароў: «Партызан!» Я яму: «Не, я не партызан, пан, мне ўсяго трынаццаць гадоў...» Ён дулам паказаў, каб я ішоў наперадзе, і павёў мяне па сцежцы да прыстані на нашым возеры. Там, гляджу, гарыць касцёр пад ёлкай, а побач — палатка, каля яе фашыстаў, можа, чацвёра. Я, канечне, падумаў, што ён мяне прывёў за кастром глядзець, галавешкі падварушыць, і пасунуўся быў да вогнішча, але фашыст мяне нагой штурхнуў, а тыя, што каля палаткі былі, рагаталі, уздзеўшы на морды зялёныя сеткі ад камароў...

Заплакаў я, а фашыст паказвае, каб я лёг ля кастра ўніз тварам і нікуды не глядзеў. Я лёг. Але, калі ён адвярнуўся да палаткі, я скасавурыўся і ўбачыў, што фашыст гэты кінжал з чахла выцягвае. Кінжал разам з патранташам там на калку вісеў... Гэта было для мяне страшней за ўсё, што перажыў. Падумаў: хай лепш застрэліць, чым рэзаць будзе! Бачыў, як рэзалі маіх родных і суседзяў... Затрэсла мяне, як у ліхаманцы, і я ўскочыў, кінуўся ў кусты, да возера. Але там было многа немцаў. Яны мыліся на прыстані. Па мне разы тры ці чатыры стрэлілі. Я, нібы заяц, прабег крыху берагам возера, заскочыў у кусты, дзе цяпер брацкая магіла (а на ёй нейкая птушачка нават гняздо звіла)... Праляжаў я ўвесь дзень да ночы пад густой ёлкай. А як стала цёмна, выйшаў на поле і пайшоў за Чарнаручча.

Пратуляўся я тады па лесе і па полі шэсць дзён. Галодны быў, еў толькі шчаўе, жыццё маё канчалася. І толькі на сёмы дзень, выбіўшыся з лесу ля Воснава, убачыў вартавога не ў зялёным шынялі, а ў плашчпалатцы, — партызанскага вартавога.

Партызаны аб'явілі, што немцаў у наваколлі ўжо няма. Праз дзень я з цёткай з Садкоў пайшоў у Мурагі. Прыходзім на тое месца між узгоркаў, дзе хаваліся мурагоўцы ад немцаў. Узгорак быў нядаўна засеяны аўсом. Паспеў авёс той зарунець. Гэта немцы авёс пасеялі, каб сляды схаваць. А з-пад руні прабіваецца ўсюды жоўты пясок — пясок з магілы маіх родных і суседзяў...

Хачу зрабіць цяжкую работу: напісаць зусім непрыдуманую кнігу. Кнігу пра маіх землякоў з Ушацкага раёна. І чым больш думала, як яе пісаць, тым больш пераконвалася, што лепш за ўсё будзе, калі людзі раскажуць пра сябе самі.

Жыццё не песціла маіх землякоў у далёкія мірныя гады. А з першых дзён вайны яны ваявалі — на фронце, у партызанах. Пралівалі кроў, хавалі таварышаў, бацькоў, дзяцей, трацілі набытак, галадалі і мерзлі, але не скараліся перад ворагам: над тэрыторыяй раёна ледзь не ўсе гады акупацыі лунаў чырвоны сцяг...

Прапаную чытачам «Літаратуры і мастацтва» некалькі старонак з кнігі пра земляко ў.

Аўтар.

СЯРОД КНІГ

У ЛЮСТРЫ ПАРОДЫІ

ТАЛЕНТ парадыста — рэдкі талент. Парадыст павінен спалучаць у сабе здольнасці крытыка і пісьменніка. Ён павінен умець зрабіць беспамылковы крытычны аналіз літаратурнага твора і ўзнавіць гэты твор у стылі і вобразах аўтара.

З Георгіем Юрчанкам, аўтарам кнігі «Вярхом на вожыку», гэтага не здараецца. Ён умее разабрацца ў вартасцях і недахопах стылю сваіх «пацыентаў» і ўмее пісаць часам «лепш» за іх (і ў гэтым няма нічога незвычайнага: М. Святлоў зусім сур'ёзна гаварыў пра вядомага рускага парадыста А. Архангельскага, што ён па-святлоўску піша лепш за самога Святлова).

Г. Юрчанку ўдаюцца пародыі і на вершы, і на прозу, і на крытычныя творы. Але найбольш удала «ўскрывае» ён, мне здаецца, арганізм прозы.

Вось, напрыклад, пародыя на І. Грамовіча «Воблакі над авечкамі»:

«О, воблакі...

Што ёсць прыгажэйшае, чым воблакі? Белыя і кучаравыя, далёкія-далёкія. Колькі разоў у маленстве я шпурляў палкай у воблакі! Здаецца, вось-вось удару. Аж не. Палка вярталася на зямлю-матухну, нават не закрануўшы іх. Ведама, дурненькі быў. Аж брыдка ўспомніць. Каб на цяперашні розум, дык хіба дазволіў бы такое? Нік-колі!..»

Тут абыгрываюцца некаторая беспадстаўная замілаванасць і схільнасць да трызмаў, што не-не ды і прамільгне ў творах І. Грамовіча. А гэтае «нік-колі» (а ніжэй ідзе яшчэ «цуд-д-доўна») вельмі хораша падкрэслівае манеру аўтарскага чытання, спосаб падкрэсліць найбольш удалыя, на думку аўтара, мясціны. Адзін штрых — і перад намі калі не творчы партрэт, дык вельмі істотная яго рыса.

У паэтычным раздзеле кнігі адна з лепшых пародый — «Зразумеў» (Ніл Гілевіч). Адштурхнуўшыся ад радкоў паэта:

«— Ты не фея? — запытаў ласкава. — Не, — крутнула галавой, — я — Зося!» Г. Юрчанка пакідае сюжэт верша некранутым:

Падыходжу, мелькам аглядаю:
Так, нішто — абута і адзета.
— Ты не фея? — ласкава
пытаю.
— Не, — сярдзіта кажа, — я —
Сынклета.

Гэтае абытаўленне паэзіі нарастае ў наступнай страфе:

— Дай, — кажу, — Сынклета,
пацалую.
Рад я, што спаткаў цябе,
нарэшце.
Можа, яблыкам крамяным
пачастуеш?
А ў адказ:
— Мо дулю хочаш з'есці?

Ставячы побач «яблык» і «дулю», парадыст ужо дасягае пэўнага камічнага эфекту. Але мэта пародыі не ў гэтым. Мэта, дасягаецца ў наступнай страфе:

І пайшла,
І знікла так раптоўна,
Нібы фея ў дзікіх скалах-
стромах.
Тут я зразумеў, што
нетактоўна
Прыставаць да дзевак
незнаёмых.

Г. Юрчанка непрыкметна падводзіць нас да разумення аднаго з недахопаў творчай манеры паэта, які часам збіваецца ў некаторых сваіх вершах на маралізатарства.

Нарэшце, «крытычная» пародыя. У артыкулах і рэцэнзіях Д. Бугаёва, напрыклад, парадыст прыкмячае характэрнае для гэтага крытыка шматслоўе, у якім падчас патанае прадмет даследавання, і ў пародыі малюе тыя лагічныя кругі, якія робіць аўтар вакол думкі, часам так і не набліжаючыся да яе. Вось урывак з пародыі на Д. Бугаёва, названай «Праблема своечасовай кропкі»:

«Дык вось. Як справядліва заўважыў нехта з не вельмі вялікіх, часам бывае дарэчы не толькі пагаджацца, але дзекольвечы і не пагаджацца з думкамі іншых. У канчатковым выніку тэарэтычна, як той казаў, небяспекі ад такой пастаноўкі пытання я не бачу. Назіранне гэтае, зразумела, не пазбаўлена парадаксальнасці, слушнае не толькі само па сабе, але і ў адносінах, так сказаць, магчымых непразуменняў. Таму, бясспрэчна, паэт меў рацыю, калі ў радку «О, як кармілі б грудзі такія» паставіў коску».

Парадыруючы празаіка, паэта, крытыка, Г. Юрчанка застаецца верным аднаму — прынцыпу адбору твораў для парадыравання. Асноўная мішэнь для яго — дробнатэм'е.

Камічны эфект у пародыі дасягаецца шляхам спалучэння «высокіх слоў», якімі карыстаецца аўтар, з прадметам невымерна «ніжэйшым», чым у аўтара. Само сабой вядома, што парадыраванню лягчэй паддаюцца, так сказаць, тыя творы, у якіх ужо ёсць гэтая неадпаведнасць. Напрыклад, ці так ужо шмат давялося перайначваць Г. Юрчанку, скажам, у пародыі на вершы М. Арочкі, калі замест апетых паэтам рукавіц ён узяў нагавіцы?

У многіх «антытворах» Г. Юрчанкі, сабраных у кнізе «Вярхом на вожыку», парадыруецца не той ці іншы літаратурны твор, а асоба самога аўтара. Тут у некаторых выпадках пародыя набліжаецца да эпіграмы.

Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова параўнаць дзве пародыі Г. Юрчанкі — «У пошуках пошукаў» (П. Макаль) і «Кулінін сын» (Р. Барадулін). У першай падмечана імкненне таленавітага паэта авалодаць вяршынямі тэхнічнага майстэрства, што ператвараецца часам у самамэту, у пошукі саміх пошукаў. Парадыруецца менавіта гэты, **літаратурны** бок з'явы:

Рыфмы — лейцы на шыі,
Асананс — трын-трава.
А-о-у-э-ы-і-і,
І-ы-э-у-о-а!
Вось кірунак галоўны,
Вось мой шлях баявы:
Верш я выдаў бясслоўны —
Будзе безгукавы...

Пародыя «Кулінін сын» гаворыць не аб сутнасці паэзіі Р. Барадуліна, а пра яго нібыта памкненні на аднаасобнае валоданне Парнасам:

Штурхну з вышынь Вялюгіна
і Танка
І сяду сам.
На ўвесь Парнас — адзін!
І хай мяне на сонечным
паўстанку
Сысці не кліча водар баравін.

Тут парадыст ужо выходзіць за рамкі ўласна літаратурнай творчасці паэта. Пародыя гэта — хутчэй эпіграма. Але ў такой сваёй якасці яна занадта расцягнута, у ёй слаба ўлоўлены стыль Р. Барадуліна. І гэтае апошняе — адзін з недахопаў кнігі «Вярхом на вожыку».

Увогуле, многія, асабліва вершаваныя, пародыі Г. Юрчанкі непамерна расцягнутыя і, пэўна, як вынік гэтай расцягнутасці, бяззубыя. Часам Г. Юрчанка паўтараецца, выкарыстоўвае адзін і той жа прыём (Так, М. Скрыпку і Ул. Паўлаву ён прад'яўляе адно і тое ж абвінавачванне — што чытачы спяць над іх кнігамі. Пародыя на вершы М. Арочкі напісана занадта «правільным» вершам, вершам, які не вельмі ўласцівы паэту.

Некалькі слоў аб афармленні кнігі. Мастак Б. Забораў, вядомы чытачам як своеасаблівы майстар кніжнай графікі, выступіў тут цікавым шаржыстам. Шаржы мастака, акрамя партрэтнага падабенства, дакладна выказваюць тое, што гаворыцца аб арыгінале ў пародыі. Цікавыя і ілюстрацыі Б. Забораву, выкананыя дзе ўпэўненай і яркай лініяй, дзе тонкім штрыхом, дзе ўстаўкай аплікатыўнага характару. Дасціпна вырашана і вокладка кнігі. Два шаржыраваныя персанажы адлюстроўваюцца на своеасаблівым экране, але не ў тым парадку, як яны намаляваны, а ў перавернутым: той, што быў злева, на экране аказаўся справа, і наадварот, быццам на іх скіраваны дзве крыніцы святла. Гэтымі крыніцамі святла з'яўляюцца імя і прозвішча аўтара, і тым самым выяўляецца сэнс усёй кнігі, кнігі, якая «пераварочвае» змест парадыруемых твораў.

Нарадзілася арганічная садружнасць парадыста і ілюстратара. Магчыма, гэтай садружнасці суджана жыць доўга.

Б. КАЗАНАЎ.

Георгій Юрчанка. «Вярхом на вожыку». Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1968.

Вокладка і малюнкі мастака В. Шаранговіча да кнігі Міколы Ракітнага «Вясковыя навелы», якая рыхтуецца да друку ў выдавецтве «Беларусь».

КРОКІ СТАНАЎЛЕННЯ

Гісторыяй беларускай драматургіі А. Семяновіч займаецца ўжо даўно. Яшчэ ў 1961 годзе выйшла ў свет ягоная кніга «Беларуская драматургія», у якой даследчык прасачыў шлях развіцця дакастрычніцкай беларускай драматургіі — ад скамарошых сцэнак, інтэрмедый школьнага тэатра XVI—XVII стагоддзяў, народнай драмы, батлейкі да неўміручай «Паўлінкі» Янкі Купалы.

Сёлета ў выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшла другая кніга А. Семяновіча — «Беларуская савецкая драматургія», у якой аўтар даследуе станаўленне і развіццё новай беларускай драматургіі — драматургіі сацыялістычнага рэалізму.

У цэнтры ўвагі даследчыка драматургічныя творы беларускіх пісьменнікаў першага савецкага пятнаццацігоддзя (1917 — 1932 гг.). Гэта быў знамянальны час у гісторыі нашага народа. Калісьці занядбаная, падняволная Беларусь стала раўнапраўнай савецкай рэспублікай, заняла «свой пачэсны пасад між народамі». Адкрываюцца першыя тэатры, па гарачых слядах падзей пішуцца першыя п'есы.

Даследаванне А. Семяновіча пабудавана ў гісторыка-літаратурным плане. Развіццё новай беларускай драматургіі ў першыя пятнаццаць савецкіх гадоў ён падраздзяляе на тры перыяды: 1917—1920 гады, 1921 — 1925 і 1926—1932 гады.

Разглядаючы драматургію перыяду грамадзянскай вайны, А. Семяновіч справядліва адзначае, што многім сцэнічным творам Ул. Галубка, Ц. Гартнага, М. Чарота быў уласцівы заліпні меладраматызм, у іх было празмерна вадэвільна-фарсавых, гратэскна-шаржавых элементаў, ім бракавала псіхалагізму пры стварэнні чалавечых характараў, пераважаў этнаграфізм. Аўтарам першых савецкіх п'ес яшчэ неставала ўмельства ствараць глыбокамастацкія творы, маляваць яркія карціны барацьбы працоўных за Савецкую ўладу. Тым не менш, п'есы Ул. Галубка, Ц. Гартнага, М. Чарота карысталіся ў гледача велізарным поспехам. У першых сваіх п'есах беларускія драматургі паказвалі пераважна жыццё народа ў перадрэвалюцыйны час. Яны ўзнаўлялі карціны галечы беларускага сялянства, асобныя эпізоды барацьбы сялян з памешчыкамі, стыхійнага разгрому маёнткаў і падзелу панскай зямлі. Ул. Галубок і М. Грамыка закранялі ў сваіх творах праблему сацыяльнага «разлому» ў асяроддзі саміх эксплуататарскіх класаў, спрабавалі ствараць вобразы самаадданых змагароў за народнае шчасце, барацьбітоў з ненавісным памешчыцка-капіталістычным ладам. І менавіта гэтым сваім пафасам барацьбы, пафасам нараджэння новага жыцця першыя сцэнічныя творы беларускіх пісьменнікаў хвалявалі тагачаснага гледача.

Беларуская драматургія, гаворыць даследчык, развівалася ў цеснай сувязі з развіццём драматургіі іншых савецкіх народаў, у першую чаргу з развіццём рускай савецкай драматургіі. Вялікі ўплыў на творчасць беларускіх драматургаў аказалі першыя п'есы К. Федзіна, Л. Ляонава, Б. Лаўранёва, у якіх глядач убачыў сапраўдных змагароў за сацыялістычную рэвалюцыю.

Адна з цікавейшых старонак беларускай драматургіі першых савецкіх гадоў — творчасць Е. Міровіча. Ягоныя п'есы «Машэка», «Каваль-ваявода», «Кастусь Каліноўскі», «Кар'ера таварыша Брызгаліна», якія з поспехам ішлі на сцэне БДТ-1, і сёння хвалююць гледача.

А. Семяновіч даволі грунтоўна даследуе творчасць заснавальніка беларускага савецкага тэатральнага мастацтва. Е. Міровіч у сваіх драмах уваскрашаў гераічнае мінулае нашага народа. Чаму маладая савецкая драматургія звярнулася менавіта да гэтай тэмы? На гэта, гаворыць даследчык, былі важкія прычыны. Мінулае нашага народа, яго лёс, жыццё і барацьба на працягу стагоддзяў былі сапраўдным дзірваном на маладой мастацкай ніве. Неабходна было з пазіцый сучаснасці асэнсаваць гераічныя старонкі народнай гісторыі ў імя сцвярджэння заваёў Савецкай улады. Гэта ў меру сваіх сіл і таленту і рабіў Еўсцігней Афінагенавіч Міровіч.

Найбольшых поспехаў беларуская савецкая драматургія дасягае ў другой палове дваццатых — пачатку трыццатых гадоў. У тэатры прыходзяць новыя драматургі, з'яўляюцца новыя п'есы. Героікай сацыялістычнага будаўніцтва прасякнуты такія творы, як «Мост» Я. Рамановіча, «Качагары» і «Новы горад» І. Гурскага, «Гута» Р. Кобеца. Усё шырэй і глыбей раскрываюць драматургі складаныя праблемы развіцця сацыялістычнага грамадства. З'яўляюцца п'есы Я. Коласа «Вайна вайне», «Бацькаўшчына» К. Чорнага, у якіх — яркія чалавечыя характары, а ў цэнтры падзей — значныя сацыяльна-гістарычныя з'явы.

Гаворачы аб развіцці беларускай драматургіі 1917—1932 гадоў, даследчык (магчыма, сцісла) падае і агульную карціну развіцця ўсёй савецкай драматургіі. Праўда, тут з некаторымі яго заўвагамі пагадзіцца цяжка. У прыватнасці, у п'есах К. Транёва «Любоў Яравая», «Бронецягнік 14-69» Ус. Іванава аўтар бачыць толькі «хранікальнасць, шматэпізоднасць, шматперсанажнасць».

Калі ж гаварыць пра тое, чаго нестае даследаванню, дык гэта, перш-наперш, вострай палемічнасці, шырокага погляду на развіццё беларускага мастацтва ўвогуле.

Напрыклад, даследчык адзначае, што Я. Усікаў, А. Саннікаў, У. Карабан, А. Макарэвіч у свой час выпусцілі ў свет асобныя даследаванні, прысвечаныя развіццю беларускай савецкай драматургіі, аднак, на жаль, нідзе не спасылаецца на сваіх папярэднікаў, не ўступае з імі ў палеміку. А між тым, для спрэчак і палемікі ёсць, думаецца, падставы. Не называе даследчык і прац беларускіх тэатразнаўцаў Ул. Няфёда, С. Пятровіча, А. Бутакова і іншых, якія займаліся пытаннямі станаўлення беларускага савецкага тэатра, а, значыць, і пытаннямі станаўлення беларускай драматургіі.

А. Семяновіч, даволі грунтоўна аналізуючы творчасць таго ці іншага драматурга, вельмі скупа гаворыць аб жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка, аб своеасаблівасцях яго таленту, адметнасцях і кірунках яго творчых пошукаў. Гэта, несумненна, збядняе гаворку.

Хацелася б папракнуць аўтара і ў некаторай сухасці і аднастайнасці аналізу, асабліва там, дзе справа датычыцца пэўных з'яў і фактаў драматургічнай літаратуры.

Аднак гэтыя недахопы, думаецца, не зніжаюць агульнай вартасці даследавання А. Семяновіча. Даследчык упершыню стварыў цэласную карціну развіцця ўсіх жанраў беларускай савецкай драматургіі — ад яе вытокаў да 1932 года, паказвае, як беларуская драматургія станавілася на шлях сацыялістычнага рэалізму, як яна пазбаўлялася схематычнасці і плакатнасці, як паступова асэнсоўвала нашу сацыялістычную рэчаіснасць, як на сцэну выходзіў новы герой — савецкі чалавек, змагар і будаўнік.

С. МІСКО.

А. Семяновіч. «Беларуская савецкая драматургія». Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск, 1968.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

НА ЎЗМЕЖКУ ПАЎСТАГОДДЗЯ

Уладзіміру ШАХАЎЦУ — 50 гадоў

Заўтра пісьменніку Уладзіміру Шахаўцу, аўтару аповесцей «Землякі», «Насустрач», «Бывайце здаровы», «Пасля вяселля», «Месца ў жыцці», «Крылаты дзень», «Чорны снег», спаўняецца 50 гадоў. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім цёпла віншуе Уладзіміра Міхайлавіча Шахаўца з гадавінай з дня нараджэння і жадае яму радасці, натхнення, новага плёну ў творчай працы.

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» таксама віншуе юбіляра і зычыць яму доўгіх гадоў жыцця і творчых поспехаў.

□

Ён пачынаў з вершаў. Сярод маладой паэтычнай плыні пасляваенных гадоў струменіла і сціплая крынічка Уладзіміра Шахаўца. І раптам абарвалася. Зрэшты, гэта, мабыць, не тое слова. Не абарвалася, а пералілася ў прозу.

І вось адна за адной выходзяць яго аповесці, і вось ужо імя празаіка Уладзіміра Шахаўца займае трывалае месца ў празаічнай рубрыцы. Кнігамі пісьменніка сёння можна заняць ладнаватую палічку. Ёсць, вядома, сярод іх і больш і менш удалыя. Мне асабіста найбольш дарагія тыя яго кнігі, дзе стрымана, але настойліва прабіваецца, як кажуць, паэтычны пачатак. Больш за ўсё мяне ўразіла яго аповесць «Насустрач». Па-першае, гэта была адна з першых у нашай літаратуры белерыстычных кніг, напісаных удзельнікам партызанскага руху. Па-другое, кніга вылучалася вялікай праўдзівасцю, праўдзівасцю і характараў дзеючых асоб, і праўдзівасцю нават самых дробных дэталей. Усё, аб чым пісаў Ул. Шахавец, ён сам бачыў і перажыў, і таму ўсё тое бачу і перажываю я, чытач.

І вось у драматычны сюжэт натуральна ўваходзіць зусім нечаканы, па-майстэрску выпісаны дакладны малюнак. Партызаны ідуць праз лес на баявое заданне. На ўскрайку лесу працавіта гудзе трактар. Так, мірны сталёвы конь робіць сваю справу. Чалавек за рулём дбае пра будуны хлеб. А навокал — вайна...

Такое ў літаратуры пра партызанскія дні і ночы было напісана ўпершыню. Я адчуў у гэтым паэтычны пачатак.

Мяркуючы па бібліятэчных фармулярах і па тым, як разыходзяцца аповесці Ул. Шахаўца ў кнігарнях, можна сцвярджаць, што ў пісьменніка шырокае кола сталых чытачоў. Мабыць, і яны цэняць яго добрую назіральнасць, стрыманую і строгую палітру, тое паэтычнае рэха, якое можна пачуць, калі ты прыслухаешся да нетаропкай і ёмістай прозы Ул. Шахаўца.

Заўтра майму сябру Уладзіміру Шахаўцу — 50 гадоў. Пяцьдзесят — гэта ж няшмат. А мой сябра мае ўжо шмат літаратурных «хрэснікаў». Вопыт уласнай творчасці і веданне «сакрэтаў рамяства» ў Шахаўца зайздросныя, і ён шчыра аддае іх маладым аўтарам. Колькі юнакоў (а часам і даволі сталых людзей) прыносілі яму ў рэдакцыю дзіцячай і юнацкай літаратуры выдавецтва свае рукапісы, нясмела пераступаючы парог пакою на чацвёртым паверсе Дома друку! І як часта гэты парог, дзякуючы гаспадарскаму і добразычліваму характару загадчыка рэдакцыі, аказваўся парогам, за якім адкрываўся маладому таленту шлях у літаратуру. Звычайна Уладзімір Шахавец, віншуючы навічка з першай кнігай, гаворыць: «Ну, а цяпер — трымайся!..» Ён выхоўвае сваіх «хрэснікаў» высокай патрабавальнасцю і сяброўскай падтрымкай.

Думаю, што сплаў цудоўных чалавечых якасцей і якасцей мастака, які не ганяецца за славай, і робіць пісьменніка сапраўдным працаўніком літаратуры.

Дык няхай жа і на ўзмежку паўстагоддзя адкрываюцца перад маім сябрам шырокія далягляды сумленнай творчасці!

Барыс БУР'ЯН.

ЛЮБОЎЮ КРОЎНАЙ

Люблю цябе, жыццё, любоўю
кроўнай.
Я не нахлебнік твой. Я на
зямлю
Не для таго прыйшоў, каб
жменяй поўнай
Уцехі браць. Я аддаваць
люблю.

Тым, што зрабіў, любоў я
вымяраю.
І калі мой апошні час прыйдзе,
Павінен ведаць я, што паміраю,
Аддаўшы ўсё да кропелькі —
табе.

Ніл Гілевіч, «Лісце трыпутніку»... Гэту кніжку ў чорным пераплёце я з хваляваннем чытала ад першай да апошняй старонкі. Паэтаў неспакой уварваў у сябе трывогі і беды многіх людзей, паэтава натхненне аддадзена роднаму краю, усім яго «стапявучым мовам» («і ўсё да болю блізкае, і ўсё — старонка мілая!»). З намі вядзе размову сучаснік, для якога невымоўна дорага ўсё, што звязана з высокім імем «Чалавек» і з гордым словам «Беларусь»... І, дзякуючы паэту, мы мацней адчуваем сваю духоўную роднасць з людзьмі, прыродай, векам...

Не адбірайце музыкі ў паэта,
Заканадаўцы паэтычных мод!
Яна з ім дружыць ад стварэння
свету,
Ва ўсякім разе — сотні тысяч
год.

Яна не толькі ўмее
калыханкай
У вечаровай цішыні гучаць,
Але й звінець, як сталь,
Зіхцець маланкай
І калі трэба — громам
грукатаць!..

Адчуванне слова, музыка паэта... «Мой сіні бор, мой родны бор зялёны!..» «Туманом празяблым вечар апусціўся на палі. Задымілі ў вёсцы печы — быццам хмаркі паплылі...» «Заміграе, сціхае мая залатая дуброва, асыпае, скідае на дол свой задумлівы ўбор...» Музыка паэта... «Гарыць, гарыць мая Лагойшчына — і позна ўноч, і рана ўранку. Шалёна-дзікая разбойшчына руйнуе край бесперастанку...» «Застаўшыся з маленства на вайне, я аднаго хачу, мая краіна: каб гэта скончылася ўсё на мне. Каб гэта ўсё не стала доляй сына»... «Лёгкая, як воблачка, як прыпеўка ў песеньцы, у бліскучых лодачках збегла ўніз па лесвіцы»... То суровы рэквіем, то сонечны мажор, то светлая задуменнасць, то сама гарэзнасць з вясёлымі праменьчыкамі вакол прыжмураных вачэй.

Праўда жыцця, праўда пачуцця і думкі. Глыбока вынашаная любоў да роднага краю, «які свяцей усіх святынь у сэрцы», які «з руін бязмоўных зноў песняй прарос да сонца», гордасць за сціплы і мужны народ беларускі, за песенную мову матчыну, — гэта выказваецца паэтам шчыра, натуральна, неназойліва, калі чытаеш яго вершы — на душы святлее.

Асобны раздзел у зборніку складаюць творы, народжаныя ў падарожжах па нашай краіне і паездках за мяжу. Тут і Японскае мора, і Сібір, і Польшча, і Балгарыя. Найбольш у раздзеле «балгарскіх» вершаў. Гэта зразумела. Паэт даўно парадніўся з Балгарыяй, яе народам і балгарскай культурай. Ён любоўна пераклаў шмат твораў балгарскіх пісьменнікаў на беларускую мову, неаднойчы паэт быў жаданым госцем Балгарыі, ён любіць, як родныя, балгарскі лістапад, «пагоркі верненскія», песні прыдунайскага краю. І «балгарскія» вершы паэта — вершы пра «братэрскае шчасце». У іх — радасць ад пачуцця роднасці з балгарскімі братамі, і святы клопат аб тым, каб гэта роднасць мацнела.

Вершы Ніла Гілевіча прасякнуты вялікай любоўю да людзей, да зямлі, да жыцця, і гэта адчуваеш, бадай, на ўсіх старонках яго кнігі «Лісце трыпутніку».

Хочацца адзначыць яшчэ, што паэт з ухвальнай строгасцю адабраў творы для кнігі. У «Лісці трыпутніку» — усё лепшае, што напісана Н. Гілевічам.

Ніна МАЦЯШ.

г. Белазёрск.

Ніл Гілевіч. «Лісце трыпутніку». Выбраныя творы. Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1968.

ЖЫЎ ПАЭТ ПАРТЫЗАНСКІ...

ГАВОРАЦЬ ВЕРШЫ

З хаты яго забралі паліцаі, павезлі ў Лепель. Васьмёра дзетак галаслілі па бацьку. Дзе падзелі бацьку — невядома. Кажуць, прывезлі знарок на роднае Казіміроўскае возера і ўтапілі. Утапілі ў тым возеры, дзе ён некалі лавіў рыбу. Апошнім часам — быццам для немцаў. Лавіў, хадзіў па беразе возера ды прыглядаўся, у якіх хатах асталяваліся акупанты, колькі іх, чым узброены. А пасля звесткі гэтыя перадаваў партызанам. Атрымліваў новыя заданні.

Адным з галоўных заданняў было — пісаць вершы. І чалавек пісаў — начамі, пры газоўцы, пры завешаным посцілкай акне, калі спалі меншыя дзеці (старэйшы сын быў партызанам). Нядужа вялікі грамацей быў гэты творца, у мірным часе — калгасны брыгадзір. Але вершаў ягоных чакалі ў атрадах. Вершы былі, як зброя. Іх змяшчалі ў насценгазетах і баявых лістках. Прасілі новых. І паэт сарамліва скуб шчаціннё на твары, а вочы свяціліся радасцю. І болем. І гневам. І пра гэта — у вершах.

У КРЫВАВАЕ ДВУХГОДДЗЕ

У крывавае двухгоддзе
З партызанскага прыволля
Зверу-Гітлеру прысуд
Ад народа я нясу.

Ой ты, Гітлер, з гадаў гад,
Азірніся, звер, назад.
А назад — на два гады,
Колькі ты зрабіў бяды!

Ты мільёны дзетвары
Знішчыў з свету без пары.
Сам з сваім ты гадаўём
Клаў у ямы іх жыўём.

Праліваў ракою кроў
Нашых сёстраў і братоў.
Сёды нашы папаліў,
Люд жывы агнём смаліў.

Фрыцы-гансы-гітлераты
Нам нанеслі столькі стратаў,
Што іх нам не падлічыць,
Як жа жыць?
А будзем жыць!

Вецер з поля гнеўна свішча
Над счарнелым папялішчам.
Люд, загнаны ў глуш лясоў,
Ждзе ўжо сонечных часоў.

Надыходзіць трэці год,
Злягуць фрыцы ўсе пад плот.
У Берліне кат дрыжыць.
Рань фашысцкая бяжыць.

А Масква на ўсё багата,
Куляметы, шле, гарматы,
Шле свінец і дынаміт,
Каб не ўскрэс павек бандыт!

НАКАЗ СЫНУ

Рада была маці
У нядзельку рана,
Вышла праважаці
Сына ў партызаны.

— Ідзі, ідзі, сынку.
Знішчыш немца-гада.
Бо няма з фашыстам
Нам інакшай рады.

Патаптаў нямала
Край наш беларускі,
Забраў яйкі, сала,
Гусак на закускі.

Надзяліў зямлёю
І маленькіх дзетак...
Знішчыў разам з імі
Бацькаўскі палетак...

Армії Чырвонай
Ідзі на спатканне,
Зноў Радзіме нашай
Прынясі світанне!

ДРУГІ НАКАЗ СЫНУ

Свой шлях, пачэсны і
празрысты,
Абраў яшчэ ты юнаком,
А мой наказ: «Знішчай
фашыстаў,
Чым можаш — куляй ці
штыком!

Няма патронаў — бі прыкладам,
Звяр'ё арыйскае — даві!
Для перамогі ты над гадам
Мяне — я блізка — пазаві.

Я веру, сын, узыйдзе сонца
І зноў асвеліцца зямля,
Загляне ў нашыя аконцы
Зара маскоўскага Крамля!»

РАСПРАВА НАД МУРАГАМІ

Дым шызы чадліва кружыў на
прасторы —
Ад вогнішчаў сёл, і палёў, і
садоў.
Людзі стагналі з вялікага
гора,
Беглі у лес, у гушчар ад
звяроў.

Ішлі трыццаць два, збавення
шукалі
Між гор і балот і цяністых
кустоў.
Іх галінкі бяроз і асін
закрывалі,
Не праліў бы звяруга
нявінную кроў.

На жыццё, на раздолле
пагасла надзея,
А іх хаты, прысады палалі
агнём.
Свае джалы пускалі вужакі-
зладзеі,
На людзей наляталі начамі
і днём...

...Сабе самі глыбоку магілу
капалі,
А над імі стаялі са зброяй
звяры.
Вось пясчаная яма гатова —
пасталі
На краі яе вязні — малы і
стары...

След злачынны ад свету
фашысты хавалі.
Залацістым зярном засыпалі
яго,
Каб ні людзі, ні сонца, ні
зоры не зналі
Ні магілы той брацкай, ні
месца таго.

Не, зладзеі, сябе не схаваеце,
каты!
Гнеў народны над вамі павіс
і грыміць!
За забіты народ, спапялёныя
хаты
Не паўстанеце вы і патомак
ваш жыць!

Вершы Івана Іванавіча Лукашонка ўзяты са сшытка, зберажонага сям'ёй партызана-паэта. Загінуў ён сам. Памёр, цяжка захварэўшы ў лесе, яго сын. А вершы жывуць. Іх помняць напамяць дзеці Івана Іванавіча, іх ведаюць аднавяскоўцы. Імя паэта высечана на абеліску, пастаўленым землякамі ў гонар паўшых.

ГАРМАТА ВУСАТАГА...

Расказвае Фёдар Паўлавіч ПЯРЭДНЯ

Дзядзька Пярэдня — прыгажун. З дзядзькі Пярэдні хоць партрэты малюй. Ён рослы. Светлы тварам і воласам. У дзядзькі Пярэдні яшчэ і цяпер не абы-якія, а проста-такі казацкія вусы. А ўявіце тыя вусы гадоў дваццаць пяць назад! Бедныя пуцілкаўскія жанкі: ці адна з іх сохла па такім Грышку Мелехавым! Па ўпраўным калісь старшыні калгаса, па выдатным майстры-кавалю, пчаляру, па жвавым весялуну-расказчыку...

Крыўдуе дзядзька Пярэдня:

— Ай, ці варта ўспамінаць тое, што было!

— Ну, чаму ж, дзядзька?

— Ды хоць бы адно: сасонку ссек — на сто рублей асудзілі! Я што — сасонкі тэй не заслужыў?

Як тут суцешыць харошага дзядзьку!

— Не палучыў юбілейнай мядалі...

Вось гэта ўжо крыўда! Дзядзьку Пярэдні не далі юбілейнага вайсковага медалю? Каму ж і даваць іх! Несправядлівасць вялікая. Дзядзька быў партызанскім кавалём, ён зброю каваў, аднойчы такую гармату справіў!..

— Каля нас бальшак Бягомль — Лепель. Машыны ідуць — ажно стогнуць. Іхнія, канечне... І к нам — жох! — дзве машыны. Пулі — цюк-цюк... Я — з хаты, за стог. Тут і дождж улупіў. Куру табаку, схаваўшыся. Баначка з попелам, красіво ў мяне. Прыбягае Петрусёва матка з унукамі, радая: «Парцізаны пабілі немцаў!.. Дай сярмягу, рабят абкрыць!..».

Прыходжу ў вёску. Нікога. Толькі асталіся стараста ды сем'і, каторыя немцаў не баяцца. Ну, мне з імі не дружба. Да сваіх падаўся, у лес. Як цяпер помню, Міця Караленка страчае:

— Здароў!

— Здароў!

— Валодзю ранілі ў руку... Валодзя, прыйшоў Вусаты, у партызаны просіцца!

— Стараваt, па-мойму! — Чую, Валодзя, камбрыг, нібы не саглашаецца.

Тады я:

— Лепш паміраць стоя, чым седзя!

Памеркавалі яны і рашылі — добра, аставім. Месяц хадзіў на заданні. А потым толькі ў майстэрні робіў, кузняцом. Аж да прыходу Краснай Арміі. У нас былі царскія кавалі! Цар Міна Васільевіч і Цар Апанас Васільевіч, браты. Разам робілі ў лесе. Пастроілі там майстэрню. Дастал струмент. Калгасную кузню прывязлі. Майстраваў станкі пад пулямёты, перарабляў авіяцыйныя пад ручныя. Даставалі мальцы! Васемнаццаць, можа, пулямётаў было, а патронаў — мала. Што прыдумалі? Калібраваць памятыя!... А то мінамёт сабралі! Трубу скарысталі, з мельніцы. Я тую трубу разагнаў, раздаў, каб улазіла міна батальённая. Здзелалі баёк. Прышлося здзелаць плітку. Устанавілі, прыстроілі. Вертыкальна і гарызантальна можна было страляць...

Было клопатаў па вушы са зброяй. Вядома ж, зборная, розная. Скажам, у пулямёце лопаліся пружыны. Я пачаў іх сам робіць. Як толькі няспраўнасць, начальнік гаворыць мальцам:

— Абрашчайцеся к Вусатаму!

Роблю пружыны, а яны мне — солі дадуць...

Адзін раз арудзіе строіў. Павазіліся з ім дзён пяць! Зробілі, адным словам, усё, што нада. Прыехаў Мельнікаў, Уткін прыехаў. Нада ж паспрабаваць, як б'ець арудзіе. Як стрэльнулі — ды ў лагер Мядзведзева, суседа! Добра, што ўсе там на заданні былі, нікога не зачапіла. Звоняць адтуль:

— Хто страляў? Дзе немцы?

Нам і казаць нечага. Смех і грэх... Затое сваё арудзіе займелі. Няхай хто сунецца цяпер да нас...

Ну, а лагер у нас быў — як горад! У нас там і свет быў, паравічок работаў... У нас сіла была, ого!

ДА ЗАЎТРА!

ЮБІЛЕЙ ЗАСЛУЖАНАЙ АРТЫСТКІ БССР РОЗЫ СВЯРДЛОВАЙ

Роза Міронаўна Свярдлова. 1968 г.

Хутка на экраны выйдзе новая кінастужка «І ніхто іншы», створаная рэжысёрам Іосіфам Шульманам на студыі «Беларусьфільм». У сцэне, якая адбываецца ў кабінеце кіраўніка навукова-даследчага інстытута, — на жаль, толькі на некалькі секунд — з'явіцца невысокая статная сакратарка з маладымі вачыма. Нешта ў ёй адразу ж прыцягвае нашу ўвагу. Такое рэдка каму з акцёраў удаецца ў эпізадычнай ролі.

Адной з першых беларускіх кіназорак Р. Свярдловай гэта ўдавалася заўсёды.

У газеце «Літаратура і мастацтва» за 11 ліпеня 1935 года мне кінуўся ў вочы загаловак: «У беларускай кінематаграфіі я вырасла і знайшла сябе як актрыса». Пад артыкулам подпіс: Роза Свярдлова. Гэтае ж імя я сустрэў зноў у пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў БССР аб узнагароджанні работнікаў кінематаграфіі ў сувязі з дзесяцігадовым юбілеем беларускага кіно. У ёй гаварылася: «За асобыя заслугі ў справе арганізацыі і развіцця беларускай савецкай кінематаграфіі надаць званне... заслужанай артысткі БССР Свярдловай Р. М., кінаактрысе...»

Там жа можна прачытаць, што заслужанымі дзеячамі мастацтва рэспублікі сталі кінадраматургі Анатоль Вольны, Барыс Брадзянскі, Рыгор Кобец. Яны і многія іншыя аўтары, ствараючы свае кінасцэнарыі, разлічвалі на творчую індывідуальнасць артысткі, а першыя беларускія рэжысёры — Ю. Тарыч, У. Корш-Саблін, Э. Аршанскі, М. Авербах даручалі ёй цэнтральныя ролі ў сваіх кінастужках «Да заўтра», «Шлях карабля», «Залатыя агні», «Дачка Радзімы», «Новая Радзіма», «Хто твой сябра?».

Роза Міронаўна Свярдлова — віцяблянка. Тут, у Віцебску яна вучылася ў дзіцячай драматычнай студыі, якой кіраваў А. Шабельскі. Праз некалькі гадоў Э. Аршанскі, будучы вядомы кінарэжысёр, арганізаваў пры клубе «Прафінтэрн» «жывую газету». Р. Свярдлова выступае ў ёй. А ў 1926 годзе яна паступае на кінааддзяленне Ленінградскага інстытута сцэнічных мастацтваў. У той час там выкладалі Р. Козінцаў, Л. Траўберг, Ф. Эрмлер, Я. Чарвякоў. Здымацца пачала адразу — з першага курса. І адразу — галоўная роля ў фільме кіраўніка майстэрні Яўгена Чарвякова «Дзяўчына з далёкай ракі».

— Выходзіць, я ўжо больш за сорак гадоў звязана з кінематографам, — усміхаецца Роза Міронаўна. — Большую і, бадай, лепшую частку сваіх роляў я сыграла ў маёй роднай Беларусі, і гэтым абавязана ў першую чаргу пачынальніку беларускага кіно Юрыю Віктаравічу Тарычу, які запрасіў мяне, дваццацігадовую дзяўчыну, на вельмі адказную ролю Лізы Малевіч у фільме «Да заўтра».

Пра Тарыча Роза Міронаўна можа гаварыць доўга і ахвотна:

— Гэта быў незвычайны чалавек. Тарыч мог так настроіць да работы, да сябе, што хацелася ўсё для яго зрабіць — нават немагчымае. Я ніколі не бачыла Юрыя Віктаравіча на здымках у дрэнным настроі. Гэта ж магло адбіцца на нас, артыстах. А нам тады здорава даставалася. У павільёне, дзе мы здымалі, у процілеглым кутку другая група здымае таксама, а яшчэ ў адным кутку рабочыя будуюць дэкарацыі. Тады яшчэ акцёра асвятлялі дугавым святлом. Вельмі балелі вочы...

Я ўжо ўзрадаваўся, што, нарэшце, Роза Міронаўна пачне расказваць пра сябе і фільмы, у якіх здымалася. Але артыстка скіроўвае размову зноў на сваіх калег. Успамінае аператара Давіда Шлюглейта, які ў час здымкаў падыходзіў да пачынаючай актрысы, каб падбадзёрыць яе. Усхвалявана расказвае пра многіх цудоўных людзей, з якімі працавала разам, — артыстаў М. Блюменталь-Тамарыну, М. Чаркасава, У. Гардзіна, аператара Б. Рабава, мастака М. Літвака. З асаблівым захапленнем Роза Міронаўна гаворыць пра Любоў Мазалеўскую, з якой разам здымалася ў фільмах «Баям насустрач» і «Залатыя агні».

Сёлета Р. Свярдлова была запрошана Саюзам кінематаграфістаў БССР на свой творчы вечар, які адбыўся ў Рэспубліканскім Доме мастацтваў. Ён пачаўся праглядам фільма «Да заўтра», які большасць прысутных, уключаючы выканаўцу галоўнай ролі, не бачылі каля сарака гадоў. Яна і зараз хвалюе, гэтая нямая кінастужка, сваёй гістарычнасцю і дакументальнасцю (у яе аснове — старонка з гісторыі рэвалюцыйнай барацьбы вучнёўскай моладзі Заходняй Беларусі). Рэалістычнае майстэрства рэжысёра і сцэнарыста Я. Бахара, аператара Д. Шлюглейта, удалы падбор выканаўцаў — усё гэта зрабіла фільм «Да заўтра» класічным у беларускай кінематаграфіі. Што датычыцца артыстычнага майстэрства асабіста Р. Свярдловай, дык тут лепш за ўсё прывесці ўрывак з рэцэнзіі К. Губарэвіча. Цяперашні вядомы драматург кіно і тэатра ў 30-ыя гады быў бязлітасным кінакрытыкам. Але калі размова заходзіла пра Р. Свярдлову... Вось што ён пісаў у газеце «Літаратура і мастацтва» 22 сакавіка 1935 года: «...Вобраз інжынера Кавалёва (артыст А. Жакаў) выйшаў вельмі бледны. Акцёру не хапала іменна той непасрэднай задушэўнасці, якая характэрна для астатняга акцёрскага ансамбля і асабліва характэрна для вобраза Марыны (артыстка Р. Свярдлова)...»

Ідзе час, а я ўсё не магу забыць усхваляванага выступлення Розы Міронаўны на сваім творчым вечары. Яна гаварыла тады, што, нягледзячы на сорак гадоў, якія прайшлі з часоў фільма «Да заўтра», яна яшчэ поўная сіл, энергіі, вельмі хоча здымацца, сыграць такую жанчыну, што прайшла праз усе гэтыя доўгія гады: цікавыя, гераічныя, цяжкія. Слухаючы, я ўспамінаў, што чытаў амаль падобнае ў даваенным, памянёным ужо артыкуле Р. Свярдловай: «Мне асабіста хацелася б сыграць маладую беларускую дзяўчыну, вясёлую, разумную, адну з тых, якія вядуць трактар, скачуць з парашутам, пранікаюць у мудрую таямніцу навукі, якія ўмеюць горача працаваць, як і любіць...»

Роза Міронаўна знялася ў 25 фільмах (вядома, не толькі на беларускай студыі), стварыла вобразы, якімі можна ганарыцца. І ўсё-такі лічыць, што самыя лепшыя ролі тыя, што яшчэ пішуцца сцэнарыстамі, і якія б яна магла выканаць. Вельмі гэта неспакойны чалавек. Такія і пакідаюць след у мастацтве...

Размова заходзіць пра самыя цяжкія дні і гады ў жыцці чалавека — ваенныя. Яны пачаліся для Р. Свярдловай у Ленінградзе. Яна адпраўляе ў тыл трохгадовага сына, паступае на курсы медсясцёр палявой хірургіі. Калі ўжо не хапіла сіл, яе па Ладажскім возеры, «дарозе жыцця», перапраўляюць з гераічнага горада ў Казань. Тут яна працуе ў Маладзёжным тэатры. Выступае ў п'есах Астроўскага, Шварца, Гусева, Гарбатава. Зноў выконвае галоўныя ролі і карыстаецца папулярнасцю ў самага строгага юнага гледача. Прымае актыўны ўдзел у брыгадзе абслугоўвання шпіталяў. На яе баявым рахунку больш 700 шэфскіх канцэртаў.

Пасля вайны Роза Міронаўна ўдзельнічае ў аднаўленні горада Леніна, выступае на эстрадзе з літаратурнымі кампазіцыямі, працуе на «Ленфільме», здымаецца, удзельнічае ў дубляжы замежных фільмаў.

— Некалькі гадоў назад рэжысёр Анатоль Гранік запрасіў мяне сыграць нянечку ў фільме «Самыя першыя», — расказвае Роза Міронаўна і заходзіцца ад шчаслівага смеху. — Здымкі праходзілі не ў павільёне, а ў сапраўднай бальніцы. Апранулася як мае быць, падкатваюся да рэжысёра, пытаюся, шамкаючы: «Можа, мілок, пасцірушка якая патрабуецца? Дык скажы, не саромся». А ён так раздражнёна мне адказвае: «Не трэба мне нічога, маці, не перашкаджай, хіба не бачыш, мы тут здымаем...»

Калі Р. Свярдлова, адлятаючы з Мінска, ішла да самалёта, у мяне замест звычайных пажаданняў чамусьці вырвалася: «Да заўтра!» Гэта значыць да чарговых сустрэч у Мінску, да новых фільмаў з вашым, Роза Міронаўна, удзелам!

Ілья РЭЗНІК.

Кадр з фільма «Да заўтра!» (рэжысёр заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР і БССР Юрый Тарыч. 1929 г.). Ліза Малевіч — Р. Свярдлова.

Кадр з фільма «Шлях карабля» (рэжысёр Ю. Тарыч. 1935 г.). Журналістка Вара — Р. Свярдлова.

СЕЗОН 1968-69

БЕССМЯРОТНЫ «РЭКВІЕМ»

Роўна 100 гадоў назад — у лістападзе 1868 года — памёр італьянскі кампазітар Джаакіна Расіні — «...упоительный России, Европы баловень — Орфей» (А. Пушкін). Яго малодшы сучаснік Джузепе Вердзі, які ўжо тады меў сусветную славу, прапанаваў ушанаваць памяць Расіні рэквіемам (памінальнай імшой), калектыўна створаным лепшымі кампазітарамі тагачаснай Італіі. Сам Вердзі напісаў апошнюю частку рэквіема. Але выканаць гэты незвычайны твор не ўдалося з-за абыякавасці афіцыяльных колаў. Вердзі вырашыў захаваць напісаную ім частку рэквіема і дапісаць астатнія.

У маі 1873 года памёр італьянскі пісьменнік Аляксандра Мандзоні, аўтар славутага гістарычнага рамана «Заручаныя», адзін з ідэолагаў «Рысарджымента» (Адраджэнне) — прагрэсіўнага грамадскага руху за вызваленне Італіі ад іншаземнага ўладарання, за яе адраджэнне як адзінай і незалежнай дзяржавы. Вердзі, сам актыўны ўдзельнік «Рысарджымента», горача любіў пісьменніка, з якім быў знаёмы, схіляўся перад ім. «Я паважаю яго больш, чым каго-небудзь на зямлі, і як чалавека, і як вышэйшую шчырую славу нашай вечна пакутнай радзімы», — пісаў кампазітар у 1867 годзе.

Смерць Мандзоні ўзрушыла Вердзі. Ён загарэўся жаданнем узвесці пісьменніку музычны манумент і завяршыў свой «Рэквіем», які і быў выкананы пад кіраўніцтвам самога кампазітара ў адным з сабораў Мілана ў дзень першай гадавіны смерці Мандзоні. Потым «Рэквіем» быў паўтораны, ужо ў канцэртным выкананні, на сцэне міланскага тэатра «Ла Скала» і хутка абышоў канцэртныя эстрады Парыжа і Лондана, Вены і Берліна.

У царкоўных колах Італіі «Рэквіем» Вердзі не атрымаў адабрэння з-за «свецкага», опернага характару музыкі; ганьбавалася і вольнае абыходжанне кампазітара з кананічным лацінскім тэкстам імшы. Таму «Рэквіем» — адзін з вялікіх твораў італьянскага кампазітара — не стаў прыналежнасцю царкоўнага рытуалу і зацвердзіўся на канцэртнай эстрадзе. Даволі прыгадаць, што трупа міланскага тэатра «Ла Скала», гастраліруючы ў Маскве, выканала на сцэне Вялікага тэатра не толькі оперы італьянскіх кампазітараў, але і вердзіеўскі «Рэквіем».

Гісторыя сусветнага мастацтва ведае нямала прыкладаў, калі творы мастацтва, сюжэтна і па форме звязаныя з рэлігіяй, сваім мастацкім зместам выходзілі за вузкія царкоўныя рамкі і набывалі грамадзянскае гучанне, агульначалавечую значнасць. Такія, да прыкладу, скульптура «Майсей» Мікеланджэла, карціна «Сікстынская мадонна» Рафаэля, Ісаакіеўскі сабор архітэктара Манферана, а ў галіне музычнага мастацтва — «Імша сі мінор» і «Страсці па Матфею» Баха, «Высокая імша» Бетховена, рэквіемы Моцарта, Берліёза, Брамса. Такі і «Рэквіем» Вердзі. Ён далёкі ад звычайнай каталіцкай памінальнай імшы, хоць кампазітар і выкарыстаў традыцыйны лацінскі тэкст і традыцыйную форму рэквіема.

Сама сутнасць твораў Вердзі зусім іншая: не пакорлівасць перад вечнасцю, не страх перад гневам багоў, а пратэст супраць пакут чалавека, выказванне спачування таму, хто пакутуе, смутак з прычыны страты выдатнай асобы — вось што выказаў італьянскі кампазітар сваім «Рэквіемам». Ды і музычная мова гэтага твора далёкая ад царкоўных песнапенняў і блізкая да музычнай мовы сталых опер Вердзі, асабліва оперы «Аіда». У музыцы «Рэквіема» гучаць тая ж мужная героіка, прасветленая лірыка, глыбокія пакуты і страсная мара аб шчасці.

«Рэквіем» Вердзі, які вызначаецца грандыёзнымі маштабамі і складанасцю кампазіцыі, уяўляе для выканаўцаў значныя цяжкасці. У мінулыя пятніцу і суботу ён быў двойчы выкананы ў канцэртнай зале філармоніі аб'яднанымі сіламі Дзяржаўнага акадэмічнага хору Латвійскай ССР, салістаў Латвійскай філармоніі і Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР; і скажам адразу: цудоўная музыка Вердзі і яе натхнёнае выкананне прынеслі слухачам сапраўдную асалоду.

Латвійскі хор не першы раз гастраліруе ў Беларусі. Нам добра знаёма яго высокая выканаўчая культура, якая ў многім абапіраецца на багацейшыя традыцыі латышскага народнага харавога музыцыравання, і яго разнастайны рэпертуар, у якім заўсёды займалі значнае месца буйныя харавыя кампазіцыі. Запомнілася выкананне гэтым калектывам у адзін з яго папярэдніх прыездаў «Страсцей па Матфею» Баха. І на гэты раз нашы госці на чале з заслужаным дзеячом мастацтваў Латвійскай ССР лаўрэатам Дзяржаўнай рэспубліканскай прэміі Даўмантам Гайлісам пацвердзілі сваю рэпутацыю аднаго з лепшых акадэмічных хораў нашай краіны.

Усе групы хору добра ўраўнаважаны. Даволі ўспомніць выкананне чацвёртай часткі «Рэквіема» («Sanctus») — найскладанейшай двайной васьмігалоснай фугі, дзе ўсе галасы цудоўна праслухоўваюцца. Высокая вакальная культура артыстаў хору, культура харавога ансамбля. Шырокі і разнастайны дыяпазон маляўнічых і дынамічных магчымасцей хору — ад напружаных гучанняў у другой частцы («Dies irae») да найтанчэйшага «піянісіма» ў сёмай («Libera me»). Але асабліва важна тое, што хору ўласціва высокае пачуццё стылю твора, высокае разуменне мастацкай задачы і ўменне творча яе вырашыць. Спалучэнне акадэмічна строгага выканання, такога неабходнага пры ўвасабленні твора традыцыйнай, вякамі адстоенай формы, з праўдзівасцю, шчырасцю і шчодрасцю пачуццяў, уласцівымі музыцы Вердзі ў яго «Рэквіеме», было вельмі арганічным.

Вердзі, хоць і напісаў для «Рэквіема» многа цудоўных старонак харавой музыкі, усё ж асаблівую ўвагу аддаў партыям чатырох салістаў. Тут несумненна выявіліся музычныя схільнасці вялікага опернага майстра. Роля салістаў у «Рэквіеме» вельмі вялікая і адказная, і салісты Латвійскай філармоніі Аўстра Валдэне (сапрана), заслужаная артыстка Латвійскай ССР Эрыка Тыпайне (мецца-сапрана), Ізраіль Фейгельсон (тэнар) і лаўрэат Усесаюзнага конкурсу Ісер Бушкін (бас) аказаліся на вышыні пастаўленай перад імі задачы. Многія эпізоды з удзелам салістаў (Recordare», Lacrimosa», «Libera me»), асабліва сапрана і мецца-сапрана, пакінулі вельмі моцнае ўражанне. Хочацца толькі сказаць, што ў знешне простым «Agnus Dei» спяванне двух жаночых галасоў у актаву без суправаджэння не было ідэальна чыстым і стройным.

Заслугоўвае вялікай пахвалы работа дыпламанта Усесаюзнага конкурсу дырыжора Юрыя Яфімава. Складанейшай партытурай Вердзі ён дырыжыраваў напамяць. Публіцы гэта вельмі імпануе, хоць і не з'яўляецца асноўным паказчыкам кваліфікацыі і таленту дырыжора; важны канчатковы мастацкі вынік — як прагучаў твор. І ўсё ж дырыжыраванне напамяць з'яўляецца немалаважнай вартасцю. Яна сведчыць не толькі аб бліскучай музычнай памяці, але і аб поўным і свабодным валоданні музычным матэрыялам партытуры, прадастаўляючы дырыжору максімальныя магчымасці сумеснага музыцыравання з выканаўцамі. Ю. Яфімаў гэтыя магчымасці цалкам выкарыстаў. Яго дырыжыраванне было натхнёным.

Ахвотна падначальваліся выканаўчай волі дырыжора хор і салісты з Латвіі і артысты Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР, якія па праву падзялілі поспех канцэртаў. Не абышлося, на жаль, без дробных хібаў. Яны былі ў групе віяланчэлей (пачатак трэцяй часткі, «Offertorio»), і ў дадатковай групы трубачоў (адзін з эпізодаў другой часткі: «Tuba mirum»). Дарэчы, шкада, што гэтыя трубачы былі ў аркестры, а не на адлегласці, паводле партытуры; дэкаратыўны эфект, задуманы кампазітарам, не атрымаўся. Гэтыя «кляксы» тым больш прыкрыя, што аркестр у цэлым іграў натхнёна.

І ў заключэнне адно пажаданне — аматары музыкі вельмі хацелі б, каб Дзяржаўны акадэмічны хор Латвійскай ССР выканаў у нашай канцэртнай зале і іншыя буйныя творы са свайго вялікага рэпертуару — араторыю Гайдна «Поры года», араторыяльна-кантатныя творы кампазітараў Савецкай Латвіі.

Л. АЎЭРБАХ.

Госці Мінска

У канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся вечар вакальнай музыкі — выступаў спявак Джон Бойдэн (барытон). Мінчане цёпла сустрэлі госця з Канады, які пазнаёміў слухачоў з цікавай і разнастайнай праграмай.

Фота А. КАЛЯДЫ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 кастрычніка

Першая праграма 9-25 — тэлебачанне — школе. Гісторыя БССР. 10-ы клас. «БССР у перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі і завяршэння будаўніцтва сацыялізма». 9-50 — урачысты пленум ЦК ВЛКСМ, прысвечаны 50-годдзю Ленінскага камсамола. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 11-30 — «Па камсамоле раўняем крок». Рапарт піянеры Літвы ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ. Перадача з Вільнюса. 11-45 — на XIX Алімпіядзе (М). 14-55 — праграма перадач. 15-00 — урачысты пленум ЦК ВЛКСМ, прысвечаны 50-годдзю Ленінскага камсамола. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 17-00 — на XIX Алімпіядзе (М). 18-00 — канцэрт (М). 20-00 — «Эстафета навін» (М). 21-00 — на XIX Алімпіядзе (М).

Другая праграма 9-50 — урачысты пленум ЦК ВЛКСМ, прысвечаны 50-годдзю Ленінскага камсамола. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 15-00 — урачысты пленум ЦК ВЛКСМ, прысвечаны 50-годдзю Ленінскага камсамола. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). 19-00 — «Верныя сябры». Мастацкі фільм. 20-40 — канцэрт ансамбля песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

26 кастрычніка

Першая праграма 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Тэарэтычная механіка». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «З днём нараджэння!» (М). 10-30 — «Сцэны і вітрыны». На актуальныя тэмы (М). 11-00 — да 50-годдзя ВЛКСМ. «Дарогай бацькоў-герояў». У перадачы ўдзельнічаюць пераможцы Усесаюзных конкурсаў ваенна-патрыятычнай песні. 11-30 — дзіцячы экран. «Канікулы Баніфацыя». Мультыплікацыйны фільм. 12-00 — «Аб'ектыў». Тэлевізійны клуб кіна- і фотааматараў (М). 13-00 — «Здароўе» (М). 13-30 — «Па камсамоле раўняем крок». Рапарт піянеры Беларусі ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ. Трансляцыя на Маскву. 13-45 — «Нашы госці». Канцэрт Дзяржаўнага Варонежскага народнага хору. 14-40 — фестываль дакументальных фільмаў, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Бацька Мінай». 15-00 — у эфіры — «Маладосць». Да 50-годдзя ВЛКСМ. «Мы — камсамолія» (М). 16-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-30 — «У свеце вобразаў, слоў і фарбаў». Тэлевізійны альманах. 19-20 — на XIX Алімпіядзе (М). 19-45 — клуб аматараў песні. Канцэрт, прысвечаны 50-годдзю ВЛКСМ (М). У перапынку — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 22-00 — «Дні летнія». Мастацкі фільм (М). 23-20 — «Навіны дня». Кіначасопіс (М). 23-30 — на XIX Алімпіядзе (М). 00-30 — на XIX Алімпіядзе. Футбол. Фінал. Трансляцыя з Мексікі.

Другая праграма 11-00 — «У свеце музыкі» (М). 11-30 — «Веды» (М). 13-45 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. Е. Ільіна. «Гуля Каралёва». Першая частка (М). 18-30 — тэлевізійны фільм (М). 19-20 — «Два капітаны». Мастацкі фільм.

27 кастрычніка

Першая праграма 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — для юнацтва. «Лукамор'е». Літаратурны альманах (М). 10-45 — «Па камсамоле раўняем крок». Рапарт піянеры Украіны ў гонар 50-годдзя ВЛКСМ. Перадача з Кіева. 11-00 — «Сямёра смелых». Мастацкі фільм. 12-30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. Перадача з Тбілісі. 13-00 — у эфіры — «Маладосць». Да 50-годдзя ВЛКСМ. «Мы — камсамолія». (Уключэнне Мінска) (М). 14-00 — «Музычны кіёск» (М). 14-30 — да 50-годдзя ВЛКСМ. «Літаратурная Беларусь». Тэлеальманах. 15-20 — «Музычная шкатулка». 15-40 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Чалавек зямлі маёй». «79-я вясна». Дакументальны фільм. 18-10 — майстры мастацтва БССР. «Спявае народная артыстка БССР Л. Галушкіна». 19-00 — на XIX Алімпіядзе (М). 20-00 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Клопаты пра дабрабыт чалавека — у цэнтры ўвагі партыйных арганізацый». Выступленне першага сакратара Мінскага абкома КПБ І. Я. Палякова. 20-30 — «Еўропа: падзеі, краіны, праблемы» (М). 21-15 — да 50-годдзя ВЛКСМ. «Што сэрца гаворыць». Вечар творчай моладзі Мінска. Трансляцыя з Дома мастацтваў. 22-40 — насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі». Год 1925-ы». 23-15 — на XIX Алімпіядзе (М).

УЗНАГАРОДЫ САВЕЦКІМ І ЗАРУБЕЖНЫМ ФІЛАТЭЛІСТАМ

Журы Усесаюзнай філатэлістычнай выстаўкі «50 гадоў ВЛКСМ», якая праходзіла ў Маскве з 28 верасня па 13 кастрычніка 1968 года, прысудзіла яе лепшым удзельнікам 7 залатых, 20 сярэбраных і 36 бронзавых медаляў. Апрача таго, у ганаровым класе (для зарубежных экспанентаў) і ў класе юнацкіх калекцый, журы ўзнагародзіла памятнымі медалямі 49 чалавек. 44 экспанентам уручаны ганаровыя дыпломы.

Ганаровых дыпломаў і памятных медаляў удастоены зарубежныя філатэлісты: Б. Барскі, Э. Вянцлеўска, Б. Барташэвіч (Польская Народная Рэспубліка), Т. Гарваў і Х. Панчараў (Народная Рэспубліка Балгарыя), Л. Штэйнер і Л. Шурані (Венгерская Народная Рэспубліка), А. Колмі і І. Міку (Сацыялістычная Рэспубліка Румынія), Кім Чан Ха (Карэйская Народна-Дэмакратычная Рэспубліка) і Саюз філатэлістаў Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

Сярод савецкіх філатэлістаў, узнагароджаных залатымі медалямі па конкурсным класе — Е. Гражданкін (Арэнбург), Г. Аляксееў і Ю. Ільін, масквічы, якія прадставілі сумесную калекцыю на тэму «Заўсёды разам з партыяй» і атрымалі адначасова прызы ЦК ВЛКСМ. П. Мазур (Масква), М. Айзен (Адэса), С. Блехман (Масква), І. Марозаў (Адэса). Сярод самых юных удзельнікаў выстаўкі ўзнагароджаны дыпломам і памятным медалем вучань 3-га класа В. Біленка (Разань).

Наведвальнікі выстаўкі сустрэліся са старэйшымі савецкімі філатэлістамі Героем Савецкага Саюза Э. Крэнкелем і акадэмікам П. Рабіндэрам. Акадэміка Рабіндэра госці і ўдзельнікі выстаўкі горача павіншавалі з 70-годдзем і прысваеннем яму звання Героя Сацыялістычнай Працы. Вучонаму ўручаны памятны медаль выстаўкі.

Паштовае аддзяленне пры выстаўцы «50 гадоў ВЛКСМ» зрабіла ў дні яе работы паўмільёна спецыяльных гашэнняў, прадало 50 тысяч марак, прысвечаных Ленінскаму камсамолу, і адправіла 22 тысячы пісьмаў гасцей і ўдзельнікаў выстаўкі.

Міхаіл ЛЯЎШНЯ,
член прэзідыума праўлення Усесаюзнага таварыства філатэлістаў.
(АДН).

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ за рубяжом

ЭЛЕКТРОНІКА І ГАМЕР

Ужо некалькі стагоддзяў адна старая спрэчка раздзяляла вучоных-філолагаў, якія займаюцца праблемамі антычнай літаратуры, на два лагеры: адны лічаць, што аўтарства і «Іліяды» і «Адысеі» належыць аднаму чалавеку — Гамеру. Іх праціўнікі сцвярджаюць, што гэтыя два класічныя помнікі старажытнагрэчаскай літаратуры напісаны двума, а, можа, нават некалькімі рознымі аўтарамі. Напрыклад, на працягу апошняга паўстагоддзя сярод многіх амерыканскіх тэкстолагаў распаўсюдзілася думка, што ў стварэнні гэтых паэм прымала ўдзел, прынамсі, шэсць чалавек.

Англійская газета «Сандзі таймс» сцвярджае, што зараз гэтая спрэчка, відаць, канчаткова вырашана. Спецыяліст па электроннай тэхніцы А. Мортан і прафесар вылічальных навук С. Майкельсон разам з філолагам з Кембрыджскага універсітэта Д. Чэдвігам, прыхільнікам тэорыі адзінага аўтарства Гамера, прааналізавалі тэкст паэм з дапамогай электронна-вылічальнай машыны «Атлас».

Гэты аналіз працягваўся цэлы год. Даследавалася 250 тысяч слоў. Спачатку А. Мортан і С. Майкельсон ўзялі першыя 300 слоў з 15-й кнігі «Адысеі», якія на думку Д. Чэдвіга, найбольш бясспрэчна належаць самому Гамеру, а потым правялі іх параўнанне з усімі сумніцельнымі ўрыўкамі з іншых кніг паэмы. На падставе аналізу даўжыні сказаў і іх структур, праведзенага з дапамогай вылічальнай машыны, была выяўлена дзівосная ўзгодненасць і паслядоўнасць стылю на працягу ўсяго тэксту паэм Гамера, што, на думку даследчыкаў, робіць «статыстычна немагчымым» сумеснае аўтарства некалькіх чалавек. Праведзены аналіз паказаў таксама, што нават калі Гамер і выкарыстаў вялікую колькасць міфалагічнага матэрыялу, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, ён ніколі не прыводзіў гэты матэрыял непасрэдна, а заўсёды творча перапрацоўваў яго.

Адным з канчатковых вынікаў праведзенага тэксталагічнага аналізу паэм Гамера з'явілася складанне алфавітнага ўказальніка слоў, якія ў іх сустракаюцца. Такі алфавітны ўказальнік, які падае каля 250 тысяч слоў, быў складзены з дапамогай ЭВМ «Атлас» на працягу ўсяго 30 секунд (без выкарыстання ЭВМ для выканання гэтай жа задачы спатрэбіўся б год).

Ю. ХРУШЧОЎ.
(ТАСС).

НА АРЭНЕ ЦЫРКА

ТАКІЯ ЯНЫ, ВАЛЖАНСКІЯ...

Па-мойму, няма ні аднаго хлопчыка, ні адной дзяўчынкі, якія б не любілі цырк. Мне таксама марылася стаць цыркачом—асілкам, які падымае неверагодныя цяжкасці, або грацыёзным наезнікам, або вялікім канатаходцам, які абавязкова робіць трайное сальта.

Прайшлі гады. Мне ўжо пад пяцьдзесят, а ўсё роўна па-ранейшаму цягне на арэну, да артыстаў цырка, да іх незвычайнага мастацтва. Таму зусім заканамерна, што ў адзін з вольных вечароў я аказаўся сярод гледачоў новай цыркавой праграмы «Жарты ўбок».

Гаварыць аб усіх нумарах, якія я ўбачыў, бадай, не ў маёй кампетэнцыі. Я хачу расказаць аб Валжанскіх, аб атракцыёне, які прывабіў і захапіў мяне. Хіба змоўчыш, калі з першага з'яўлення артыстаў на арэне і да расставання з гэтымі чараўнікамі, адчуваеш тую незвычайную асалоду, якая прыходзіць у хвіліны сузірання ўсяго цудоўнага, што ствараецца працай і талентам прыроджанага мастака.

Першыя хвіліны выступлення Валжанскіх на канаце настолькі складаныя і тэхнічна бездакорныя, што здаюцца фінальнымі.

Нумар за нумарам усё з большай сілай нарошчваў напружанне гледачоў, захапляў навізной і вобразнасцю. Здавалася, артысты вычарпалі ўсе свае магчымасці. Але канат па-ранейшаму, паднімаючыся ўсё вышэй і вышэй, клікаў іх за сабой ўгору, да зорнага неба. На змену Яўгеніі і Марыне Валжанскім выйшаў Слава. Ён, спыніўшыся на паўдарозе да верхняй маленькай пляцоўкі, замільгаў у шалёным разгойдванні. Як струны гітары, запелі тросы мацавання, акампануючы гэтаму своеасабліваму танцу канатаходца. Раптам, застыўшы, паслухмяны клічу вышыні, ён зноў імкнецца да зорнага неба купала. Цяпер ужо не відаць каната, здаецца ніжні, прыняўшы на сябе цяжар артыста, беражліва нясе яго ў недасягальную вышыню. Так, канат — гэты неадухоўлены прадмет атракцыёна — зрадніўся з цудоўнай сям'ёй, стаў іх сябрам, партнёрам, прывёў Валжанскіх да заслужанага поспеху, выказаўшы разам з імі іх настроі і задумы.

Прадстаўленне закончана. Трэба ісці дамоў. А я па-ранейшаму сяджу і думаю пра Валжанскіх. Не, нельга так пайсці, не пазнаёміўшыся з артыстамі.

Валжанскіх я застаў за вячэрай у нумары гасцініцы.

— Я іх толькі галоднымі да работы дапускаю,—жартуе адзін з стваральнікаў і пастаноўшчык атракцыёна Уладзімір Аляксандравіч,—інакш канат не вытрымае.

— Раскажыце, калі ласка, — прашу я,—аб атракцыёне.

Уладзімір Аляксандравіч, адсунуўшы недапітую шклянку чаю, гаворыць:

— Было гэта вельмі даўно, у 30-х гадах. Працавалі мы тады з братам партэрнымі акрабатамі, а цягнула на канат. Хацелася неяк па-новаму абыграць, ажывіць яго, калі можна так сказаць, удыхнуць у яго жыццё. У той час работа на канаце была простая і, нават, прымітыўная, як і дзвесце гадоў назад.—Валжанскі задумаўся. — Помню, еду я аднойчы ў цягніку, любуюся прыродай. Раптам перад вачыма падымаецца шлагбаум. Адразу думка: стварыць вось такі ж нахілены канат. Стаў думаць, канструяваць лябёдку. Але ўбачыў работу сясцёр Кох і, як кажуць, скіс. Яны працавалі на «светафоры», а гэта ўжо падобна на маю задуму. Давялося абдумваць усё нанава.

Кончылася вайна, падраслі дзеці. Разам з імі пачаў рыхтаваць новы атракцыён — двухярусны нахілены канат. Гэта навінка патрабавала вялікай творчай работы. Нарэшце атракцыён быў гатовы, і мы прыступілі да работы. З імі мы і выступалі шэсць гадоў назад тут, у Мінску.

Наступіла паўза. А потым загаварыў сын—Уладзімір.

— Бацька ўжо ў той час, калі мы працавалі на гэтай арэне, рыхтаваў выступленне на трохярусным канаце. Ні дня, ні вечара вольных. Працавалі да сёмага поту. Паспрабуй яго не паслухаць: бацька, рэжысёр, мастацкі кіраўнік.

— Так, — уступае ў размову бацька. — Не паслухацца было нельга. Новы атракцыён патрабаваў вельмі многага. Я прывяду вам адзін прыклад. Вы бачылі, як Валодзя з жонкай ідзе па канаце з завязанымі вачыма. А ў рэпетыцыях цалкам адключаецца святло на арэне. Вось так і астатнія нумары: кожны з іх у больш складаных умовах паўтараўся з дня ў дзень, пакуль мы не дасягнулі ўпэўненасці і сталі працаваць без страхоўкі.

Гаспадыня дома, якая дагэтуль увесь час маўчала, не вытрымлівае:

— Канатахвароба — вось чым хворы Уладзімір Аляксандравіч. І гэтымі дзіўнымі вірусамі заразіў і нас. Усе мы: я, муж і дзеці цяпер гэтак жа невылечныя, як і ён.

А я думаю аб тым, якое гэта шчасце для мастацтва, што ў ім бываюць вось такія «хворыя» — апантаныя, улюбёныя ў сваю справу майстры.

Свет ПРЫДВОРАЎ.

Пад купалам Валжанскія.
Фота Ул. БЛІОХА.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 02447.